Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714



http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 35 (2677) Год LII | Беласток, 2 верасня 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Родам з Беласточчыны

Мастак Мікалай Несцярэўскі

Застаць Мікалая Несцярэўскага ў мінскай кватэры летам немагчыма. Ён жыве на лецішчы недалёка ад Баранавічаў. „Кідай усё ў сваім горадзе і прыязджай да мяне, паглядзіш, чым я тут займаюся. У мяне сяброў бывае шмат. Я люблю іх сустракаць і разам адпачываць", — сказаў па тэлефоне спадар Мікалай.

Летась наш зямляк мастак-кераміст, сябра Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь Мікалай Несцярэўскі адзначыў сваё 75-годдзе. Але і сёння ён адчувае сябе, дзякаваць Богу, яшчэ фізічна даволі ўпэўнена і моцна. Хаця ў жыцці хапала ўсяго.

Нарадзіўся ён 31 сакавіка 1931 года на Падляшшы ў вёсцы Бацюты. „Бацька мой рана памёр, — згадвае Мікалай Лаўрэнцьевіч. — Аднойчы ён паехаў па сена зімою, а лёд быў слабы і ён з сябрам праваліўся пад лёд. Пакуль выцягнулі коней і сані, то моцна замерзлі. Пасля бацька хутка захварэў на сухоты і памёр. Яго пахавалі ў Бацютах. А маці з цягам часу выйшла замуж за другога".

— У якім годзе вы пакінулі Беласточчыну?

— Адразу пасля вайны ў 1945 годзе. Гэта быў той час, калі палякаў перасялялі ў Польшчу, а беларусаў гналі на Усход. Мы вельмі не хацелі пакідаць Бацюты, бо ў нас было 18 гектараў зямлі, 5 кароў, некалькі коней, шмат свіней, авечак, сотні курэй. Мы жылі даволі добра. Праўда, шмат працавалі, але і шмат мелі. Жылі заможна ажно да восені 1939 года. А калі прыйшлі бальшавікі, то жыць стала цяжка. І мы пад прымусам пераехалі да сваякоў у Дзятлава на Гродзеншчыну.

— Чым вы займаецеся цяпер?

— Цяпер будую на лецішчы прыгожы і вялікі дом. Ён незвычайны і непадобны на ўсе іншыя. Так што я запрашаю ўсіх беларусаў Беласточчыны да сябе ў госці ў любы час. А яшчэ займаюся жывапісам, скульптурай, керамікай. Працую як малады.

— А ці бываеце на Беласточчыне?

— Раней бываў часцей, а цяпер рэдка калі выбіраюся. Хаця ў Бацютах жыве мая родная цётка, сваякі жывуць у Бельску і ў Беластоку.

Калі сям'я Мікалая Несцярэўскага пераехала ў Дзятлава, хлопцу было 14 гадоў. Ён вельмі сумаваў па роднай вёсцы, па сябрах, якія там засталіся. Там у сем гадоў ён пайшоў у школу. Выкладанне вялося на польскай мове. Але дома гаварылі па-беларуску. „Па-простаму, таму што бацькі лічылі сябе беларусамі, праваслаўнымі", — згадвае Мікалай Лаўрэнцьевіч.

На Дзятлаўскай зямлі прайшлі яго юнацкія працяг ☞2


Фота Сяргея ЧЫГРЫНА

Уплываць на гмінныя ўлады ☞ 2

Міхась КУПТЭЛЬ

Сябра Уладзімір Сідарук з Кузавы, а можа зараз з Чаромхі-Кузавы або Чаромхі-Асады, хоць напэўна не з Чаромхі-Вёскі, хоча аднавіць пастаянныя сустрэчы карэспандэнтаў „Нівы" прынамсі раз у год.

Ідэю «Міхася Куптэля — як піша У. Сідарук — наконт сустрэч на Гайнаўшчыне як даўнейшага авангарда, так і малодшых супрацоўнікаў „Нівы"», гэта я кінуў у асяроддзе карэспандэнтаў бадай што чатыры гады таму з мэтай, каб, пішучы пра розныя жыццёвыя справы беларусаў Гайнаўшчыны, уплываць на гмінныя ўлады, каб яны перад усім бачылі справы беларусаў, а потым вырашалі іх згодна волі жыхароў і, вядома, законам дзяржавы...

Стаўка на масавы спорт ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

Размова са Славамірам ЧЫКВІНЫМ — дырэктарам Асяродка спорту і рэкрэацыі ў Гайнаўцы, шматгадовым настаўнікам інфарматыкі ў Гайнаўскім белліцэі.

— У час канікулаў асяродак ладзіў многа спартыўных мерапрыемстваў накіраваных да дзетак і моладзі. На якія гульні Вы звярнулі найбольш увагі?

— Мы зрабілі пляцоўку, прыстасаваную да пляжных спаборніцтваў і наладзілі на ёй масавыя гульні для дзетак і моладзі, якія выдатна спрычыняюцца да развіцця іх фізічнай формы...

Уік-энд на дачы ў Цялушках ☞ 8

Ніна БРУЧКО

Учора ў „Wiadomościach" падалі: уік-энд будзе вельмі цёплы, на Падляшшы прадбачваецца 30 градусаў гарачыні! Нарэшце! — уцешылася я. Тады хутчэй пакідаць запылены горад і на дачу ў вёску ўцякаць, хопіць сядзець высока ў блёку, як на „бусліным гняздзе"!

Прыязджаем на месца. Сонца падышло пад поўдзень, гарачыня. Суседзяў не відаць. „Мо прачуць сена?" — падумалася мне...

Жыццё бабулі Тоні ☞ 11

Рута

Антаніне Амельянюк з Трасцянкі прыйшлося жыць і пры паляках, і саветах, і немцах, і пры „камуне" (як цяпер завуць), і жыве яшчэ ў XXI стагоддзі. Праўда, здароўе ў бабулі ўжо слабенькае, але памяць — го, го!

Нарадзілася бабка Тоня 12 лютага 1924 года ў мнагадзетнай сям'і Вольгі і Аляксандра Федарукоў, у якіх да выезду ў Расію ў 1915 годзе было ўжо двое дзяцей. Усе з Расіі вярнуліся шчасліва...

1 ☞працяг

Мастак Мікалай Несцярэўскі

гады, тут ён пачаў свой працоўны шлях, адсюль пайшоў, як кажуць, у „вялікі свет”. Прырода шчодра надзяліла талентамі Мікалая Несцярэўскага. Спачатку ён працаваў столярам у арцелі па вырабе мэблі. Тут ён авалодаў майстэрствам апрацоўкі дрэва. А калі працаваў у Дзятлаўскім раённым доме культуры інструктарам — арганізаваў духавы аркестр. Мікалай Лаўрэнцьевіч любіць яшчэ і ўмее спяваць.

Але сэнс свайго жыцця ён знайшоў у галіне мастацкай керамікі. Праца з глінай, яе пластыка, апрацоўка заўсёды вабілі юнака. Ён паехаў працаваць на фабрыку мастацкай керамікі, што ў Івянцы, пераймаў вопыт вядомых майстроў.

У 1969 годзе наш зямляк скончыў Мінскі тэатральна-мастацкі інстытут (цяпер Акадэмія мастацтваў) і да самай пенсіі працаваў на Мінскім мастацка-вытворчым камбінаце. Працаваў плённа. Пазнаў такія сакрэты апрацоўкі керамікі, якія і цяпер не могуць паўтарыць сучасныя беларускія майстры.

Творы мастака сёння ўпрыгожваюць фасады і інтэр’еры многіх будынкаў і ўстаноў не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Ён з’яўляецца адным з аўтараў афармлення станцыі метро „Плошча Якуба Коласа” ў Мінску, будынкаў аэрапорта „Мінск-2”, кафэ „Бульбяная” ў Мінску. Сцены Гродзенскага тэатра лялек упрыгожваюць таксама яго творы. Мікалай Лаўрэнцьевіч займаўся афармленнем магазіна „Мінск” у Валгаградзе (Расія) і г.д. Працы яго можна таксама ўбачыць у аздараўленчым цэнтры „Баравічок” на Дзятлаўшчыне, на сценах Дзятлаўскай гімназіі № 1.

Нядаўна я наведаў Дзятлаўскі гісторыка-краязнаўчы музей. Яго дырэктар Фёдар Красюк паказаў усе працы Несцярэўскага, якія ён падараваў музею. Гэта цэлая вялікая калекцыя мастацкай керамікі. Тут і керамічныя пано, і посуд, і дэкаратыўныя скульптуры і пласты. Творы Мікалая Несцярэўскага проста кранаюць сваёй дасканаласцю і прыгажосцю.

— Вельмі прыемна, што шэраг маіх работ застаецца ў Дзятлаве, горадзе майго юнацтва. Няхай дакрананне да прыгожага сцвярджае ўсё лепшае, самае добрае ў людзях, дорыць ім радасць, — сказаў нядаўна Мікалай Лаўрэнцьевіч у час перадачы сваіх твораў музею, а гэта больш за 60 работ. Цэлая музейная зала адведзена жыццю і творчасці Мікалая Несцярэўскага. Тут і карціны мастака, і бюсты, і медалі, і гліняны посуд.

Шмат твораў нашага земляка захоўваецца і ў музеі Анатоля Белага ў Старых Дарогах. Тут знайшлі свае ўвасабленне ідэі па ўвекавечанні такіх постацяў нацыянальнай культуры як Еўфрасінні Полацкай, Льва Сапегі, Адама і Максіма Багдановічаў, Міколы Улашчыка, Міколы Ермаловіча, Ларысы Геніюш, Наталлі Арсенневай, Кастуся Каліноўскага, Анатоля Бярозкі і многіх іншых дзеячаў Беларусі, якія жылі ў розны час і жывуць цяпер. Бюсты, медальёны, плакеткі, жывапісныя кампазіцыі — гэта ўсё працы Мікалая Несцярэўскага. Пра іх можна расказваць і пісаць бясконца. Вось такі ён, гэты чалавек з Беласточчыны, у якога шчодрая душа і вялікі талент.

Тэкст і фота Сяргея ЧЫГРЫНА

Уплываць на гмінныя ўлады

Сябра Уладзімір Сідарук з Кузавы, а можа зараз з Чаромхі-Кузавы або Чаромхі-Асады, хоць напэўна не з Чаромхі-Вёскі, хоча аднавіць пастаянныя сустрэчы карэспандэнтаў „Нівы”, прынамсі раз у год.

Ідэю «Міхася Куптэля — як піша У. Сідарук — наконт сустрэч на Гайнаўшчыне як даўнейшага авангарда, так і малодшых супрацоўнікаў „Нівы”» гэта я кінуў у асяроддзе карэспандэнтаў бадай што чатыры гады таму з мэтай, каб, пішучы пра розныя жыццёвыя справы беларусаў Гайнаўшчыны, уплываць на гмінныя ўлады, каб яны перад усім бачылі справы беларусаў, а потым вырашалі іх згодна волі жыхароў і, вядома, законам дзяржавы, каб вырашалі не толькі паводле магчымасцей, але і больш перспектыўна.

Сябра Сідарук звярнуў увагу на тое, што гмінная ўлада ва ўсходняй Беласточчыне, у як жа прыгожым кутку дзяржавы, у выніку самаўрадавых выбараў не мяняецца гадамі. З аднаго боку стабільнасць улады гэта пазітыўная рыса. Вядома, у першым скліканні народныя абраннікі вучацца кіраваць, эфекты чаго відочныя ў другім тэрміне. Калі ўлада не мяняецца гадамі, то цяпер невядома ці ў нас наглядаецца ўраджай выдатных кіраўнікоў гмін, якіх проста заступіць няма кім, ці стварыўся дагавор чыноўнікаў і іх даверникаў у гміне ды партый, каб уладарыць дзесяцігоддзямі? Гэтае пытанне турбуе майго сябру з Кузавы, а павінна непакоіць таксама іншых карэспандэнтаў „Нівы”.

Бестэрміновае знаходжанне пры ўладзе на ўсіх яе ўзроўнях гэта не толькі козыр, але перш за ўсё хвароба руціны, якая спасцігае бадай што ўсіх кіраўнікоў. Гадамі круцяцца яны ў гэтым самым крузе спраў, немагчымасцей і прывыклых да свайго шэфа чыноўнікаў, якія не ўяўляюць сабе змен. Людзям такая сітуацыя таксама адпавядае. На пасаду войта, прыкладова, не меў вялікіх шанцаў Міхась Андрасюк, якому канкурэнцыю склаў актуальны войт Дубіцкай гміны, нягледзячы на прагрэсійную выбарчую праграму Беларускага авангарда, больш успамінаюць на старонках „Нівы”, чым кранаюць сучасную рэчаіснасць. Больш яе апісваюць, чым прапануюць штосьці іншае, новае.

Пэўна, можна наракаць, што вёска пусцее, але ёсць жа ў гэтых вёсках некалькі маладых сем’яў, якія не выбіраюцца ў далёкі свет. Добрым прыкладам гэтаму з’яўляецца Дабрывада. Хаця на чыгуначным прыпынку ад назвы вёскі асталася толькі „...вада”, то школьны аўтобус у школу ў Кляшчэлях забірае з Дабрывады каля трыццаці школьнікаў. Але перад тым, пакуль яны сталі школьнікамі, былі ў дашкольным узросце. Ці хтось з гмінных улад падумаў, каб сарганізаваць ім дзіцячы садок у пустуючай у добрым стане школе? Прадшколле патрэбнае для дабра дзетак і іх бацькоў, каб раўнялі яны да дзетак з гарадоў, якія ў трох-чатырохгадовым узросце маюць магчымасць сутыкнуцца ў садку, напрыклад, з англійскай ці французскай мовамі. Калі ад наймалодшых гадоў бракуе ім такой адукацыі, то потым аказваецца, што ў публічныя універсітэты трапляе невялічкі працэнт вясковых вучняў.

Да каго павінна належаць ініцыятыва рознага дзеяння наконт грамадства? Гэтае пытанне мае рашучы адказ — да ўлады. Не толькі да бурмістраў, старостаў, войтаў, але і да радных. І, вядома, што да чацвёртай, як кажуць, улады — да журналістаў, якія з’яўляюцца прадстаўнікамі грамадскай думкі. Мабыць, і карэспандэнты імі з’яўляюцца.

Пры нагодзе рэдактару Вярбіцкаму прапаную зацікавіцца колькі дырэктараў гмінных цэнтраў культуры, прынамсі так з цікавасці, прачытала ў „Ніве” інтэрв’ю з сабой і чаму ў Гарадскім цэнтры культуры ў Кляшчэлях няма „Нівы”? Ці то па прычыне браку сродкаў, як заўсёды апраўдваюцца чыноўнікі, калі чагось не зробяць, ці па нейкай іншай прычыне?

Міхась КУПТЭЛЬ

PS. Шчыра дзякую Уладзіміру Сідаруку за супольнае падарожжа па веласіпедных сцежках Чаромхаўскай гміны.

Вачыма еўрапейца

Фрустраваныя

Беластоцкай паліцыі і пракуратуры ўдалося выявіць і часова арыштаваць двух семнаццацігадовых юнакаў, якія ў апошні час малявалі фашысцкія і нацысцкія знакі, у тым ліку свастыкі, на сценах беластоцкіх будынкаў і ў месцах, увекавечваючых яўрэяў. Медыйная бура разгулялася канчаткова, калі чырвоная, акуратна намаляваная свастыка паявілася пад мемарыяльнай дошкай — непадалёк ад рэдакцыі „Нівы” — якая інфармавала, што якраз у гэтым месцы стаяў дом стваральніка мовы эсперанта, яўрэя па паходжанні Людвіка Заменгафа. Такая самая свастыка апынулася непадалёк, на шкляным табло з выявай даваеннага дома доктара Заменгафа. У іншых месцах Беластока былі зроблены надпісы: „Waffen SS”, „Sieg — Heil” і да г.п. Усё гэта рабіла ўражанне свядомага і мэтанакіраванага дзеяння, а не выключна смургельскага выбрыку. І фактычна паліцыі ўдалося высветліць, што абодва юнакі, Кшыштаф Дзікоўскі і Патрык Аленчук, з поўнай наўмыснасцю распаўсюджвалі фашысцкія і нацысцкія сімвалы. Першы з іх прызнаўся да свае віны і, як сцвердзіла пракуратура, нават гэтым ганарыўся. Другі да віны прызнацца не хацеў. Пры нагодзе аказалася, што замешанымі ў справу былі яшчэ іншыя маладыя людзі. Вызначана была чарговая тройка: двух пятнаццацігодкаў і адзін шаснаццацігодак. Удалося даказаць, што яны звязаны з неанацысцкай арганізацыяй у Беластоку „Czwarta Edycja”, у якой, як мяркуецца, у сталіцы Падляшша прымае актыўны ўдзел не меней чым 20-30 юнакоў. А пры нагодзе, з інфармацыі МУСіА вынікае, што ўва ўсёй Польшчы неанацысцкія групоўкі налічваюць каля 400 дзеячаў і 800 прыхільнікаў. Калі міністэрства ў змозе палічыць гэтых неанацыстаў, то можна меркаваць, што мае і персанальнае апазнанне, хто з гэтымі рухамі павязаны. Можна паставіць тады пытанне: што ведамства ўнутраных спраў робіць з гэтай праблемай?

Галоўным чынам цікавіць мяне пытанне, што спрычыняецца да таго, што сёння паяўляюцца групоўкі маладых людзей, захопленых ідэалогіяй, якую ажыццяўлялі Беніта Мусаліні ці Адольф Гітлер. Таму сягнуў я да некалькіх публікацый, апісваючых з’явы фашызму і нацызму. У адной я знайшоў тлумачэнне: „Найважнейшым дабром у фашысцкай дзяржаве з’яўляецца супольнасць, значыць, народ (як агульнасць грамадзян дзяржавы) або этнічая група як тоесная з народам”. Як кажуць навукоўцы, нацызм, як большасць таталітарызмаў, узнік ад фрустрацыі і грамадскага незадавальнення. У адрозненні ад фашызму, у нацызме пытанні расы з’яўляюцца важным кампанентам ідэалогіі, асабліва ў выглядзе апантанага антысемітызму. Усё гэта азначала б, што прычына дэманстрацыі на мурах такіх ідэялагічных сімпатый маладымі беластачанамі вяжацца, мабыць, з сітуацыяй у іх сем’ях і шырэй у дзяржаве, у якой прагучаўшыя публічна антысеміцкія выказванні і жэсты найчасцей ігнаруюцца правасуддзем. Я не веру, што цяпер затрыманыя юнакі будуць прыгавораны да найвышэйшага прадбачанага ў кодэксе пакарання, значыць, да двух гадоў зняволення. Дарэчы, сумняваюся ў пазітыўным выніку рэсацыялізацыі такога пакарання. Можа, больш паспяховым было б загадаць ім тыя два гады парадкаваць аддалены на больш чым гадзіну язды ад Беластока былы канцлагер у Трэблінцы, у якім фашысты закатавалі амаль мільён яўрэяў, у большасці жыхароў тэрыторыі сённяшняга Падляшскага ваяводства. Не ўспамінаю тут аб псіхалагічнай працы са зведзенымі фашызмам і нацызмам юнакамі, якую трэба было б правесці не толькі з імі самімі, але і з іхнімі сем’ямі, каб яны маглі неяк справіцца з гэтай фрустрацыяй і незадаволенасцю.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

У арэшкаўскай пачакальні акно і дзверы зеўраюць адсутнасцю ўсіх створак, на сценах брыдкаслоўе. Мала таго — малады век характарызуецца неадольнай прагай да ведаў, да спажывання пладоў пазнання. І ў чыгуначным будынку маладыя людзі — думаю, што гэта толькі яны — правялі своеасаблівыя майстар-класы па вывучэнню будаўнічай канструкцыі, прабуючы разабрацца ў некаторых сценах...

Спартыўны турызм

Дарога ад Ягаднік у Арэшкава жвіровая. Пабудавана яна была яшчэ ў тую эпоху, калі не ставілі побач помнікаў фундатарам дарог, як гэта побач новых асфальтовак маецца сёння дзеля ўсведамлення дабрадзействаў жыцця ў еўрапейскай супольнасці. Значыць, згаданая жвіроўка была пабудавана ў перыяд не так даўняга будаўніцтва нашай светлай будучыні. А жвіроўка, калі б яна пабудаваная не была, зносіцца, абзаводзіцца выбоінамі і час ад часу патрабуе рамонтаў. Рамонты тыя выконвае грэйдэр, машына, якая згортвае жвір з краёў дарожнага палатна і засыпае ім тыя калдобіны. Але не з усёй шырыні насыпу збірае грэйдэр жвір, бо ж з самага краю адведзена месца для дарожных знакаў і той край астаецца цаліной, на якой, як і на кожнай цаліне, буйна расце ўсялякае самасейства. З ходам часу, калі адвалы грэйдэраў штораз больш падбіраюць жвіру з насціпу, той насціл становіцца ўсё глыбей у параўнанні з цалінными берагамі. І калі пойдзе лівень, тады тыя запушчаныя берагі становяцца шчыльнымі берагамі ападкавых вадаёмаў, без адліву ў прыдарожныя равы. Равы ж тыя ў разгар ападкаў не бурляць вадой; вада ў той час шчодра залівае нізы гравійкі па ўсёй яе шырыні.

9 жніўня, пасля ліўню, які заліў усю Беласточчыну, давялося мне прайсціся згаданай жвіроўкай. І ўжо недалёка, мо з паўкіламетра ад гайнаўска-кляшчэлеўскай шашы, перада мною, як Дунай перад фальклорным казаком, разліўся такі ападкавы вадаём. Прайсці яго можна было, як і кожны брод, скінуўшы адно абутак і падкаціўшы нагавіцы. Але, як гаворыць даўняя прыказка — не зведаўшы броду, не сунься ў воду. І гэта не з-за акул ці бегемотаў, але па прычыне цывілізацыйных вынаходстваў, ад якіх жыццядайная і гаючая калісь вада бывае насычанай хімікатамі або небяспечнымі прадметамі, напрыклад, разбітым шклом.

Падаўся я ў абыход берагам, буйна аброслым высокім пустазеллем. І быў гэта ход, як гаворыць прыказка, з агню ды ў полымя. У мокрай траве ўжо за першыя крокі набраў я ў абутак вады быццам з рэчкі. Бяды не было, бо ж у той час разгар лета. Але калі б па такой дарозе давялося каму хадзіць у менш спрыяльных умовах, напрыклад, у нейкую адлігу, можна было б трапіць у шпіталь або, у крайнім выпадку — калі б там была забастоўка — нават у пахавальнае бюро.

І калі б здарыўся апошні выпадак, ці хто звязваў бы яго прычыны з правіламі дарожнай тэхналогіі? Сумняваюся; мабыць удзельнікі „апошняга развітання" закончылі б рэтраспекцыю прычын яго адно толькі на прастудзе, завяршаючы агульнай, папулярнай у нашым народзе, рэфлексіяй, што „смерць прычыну шукае". Ды нават рэтраспектыўна заглядаючы да крыніц гіпатэтычнай прастуды, складана было б патрабаваць ад дарожнікаў пракладкі тратуараў край жвіроўкі.

Ад згаданай асфальтоўкі ў Арэшкава тры кіламетры. І на гэтай дыстанцыі налічыў я на жвіроўцы пяць такіх вадаёмаў. Гэта мне нагадала пра алімпійскі стыпль-чэз такой жа працягласці, таксама з воднымі перашкодамі. За год у Пекіне алімпіяда і вось сёлета я воляй-няволяй прайшоў такую алімпійскую падрыхтоўку. Пры нагодзе варта заўважыць, што спартыўныя спаборніцтвы — хто хутчэй, вышэй, далей — з'яўляюцца вытанчаным працягам традыцыйнага штодзённага змагання за быт, якое зараз выродзілася ў экстрэмальнае змаганне за рэйтынг, значыць, за грошы, з прымяненнем хіміі — як у аграноміі змаганне за ўраджай. Хіміі, якая ў ейным фінале аказваецца ядавітай.

Час вяртацца на нашу дарогу і паставіць рэфлексіўнае пытанне: а навошта было мне лезці тыя тры мокрыя кіламетры ў бок Арэшкава, якая ад гэтага карысць? Адказваю, што варта было прайсціся не адно для шпацыру, але і для пабачання выдатнасцей тамашняга чыгуначнага прыпынку. Многія людзі любяць панаракаць, у тым ліку і на чыгуначныя ўлады, абвінавачваючы іх у развале чыгункі. А я вось, паглядзеўшы прыпынак у Арэшкаве, хачу тыя нашы ўлады пахваліць.

Зараз на вёсках паменшала насельніцтва і пабольшала самаходаў, а вынікам гэтага адыход мабільнага народу ад чыгункі. Далейшым выследкам гэтаму абязлюдзенню пасажырскага транспарту стала рэдукцыя чыгуначнага персаналу і абязлюдзенне чыгуначных будынкаў. Вось і станцыйны будынак у Арэшкаве апусцеў, і ягоныя вокны забіты дошкамі. Але добрае чыгуначнае начальства не забыла пра тых жыхароў Арэшкава і наваколля, якім усё яшчэ ў Гайнаўку прыходзіцца ездзіць на цягніках. Начальства пакінула ім пачакальню.

Цяпер пара прыглянуцца чыгуначным пасажырам — што гэта за народ. А народ гэта такі, які не мае самаходаў. Часта гэта народ, які яшчэ не мае самаходаў, значыць людзі маладыя. Але яны настолькі маладыя, што ўжо не забіраюць іх у школу гімбус. У наш бурны час малады чалавек, які не мае аўтамабіля ці нават магчымасці ім пакарыстацца, можа быць няблага сфрустраваны. Бо гэта ўжо такі чалавек, які ростам дагнаў і апярэдзіў дарослых і лічыць быць таксама дарослым, з правам карыстацца забароненымі дагэтуль спакусамі, напрыклад, важна закурыць, а не хавацца з гэтым як нейкі пацан.

Да гэтага варта дадаць заўвагу, што ў народнай традыцыі маладосць лічыцца райскім перыядам. Бо ж малады чалавек, як у біблейскім Эдэме, стаіць між двух дрэў. Дома ён усялякімі бацькоўскімі забаронамі прывязаны да бяспечнага „дрэва жыцця". А калі вырвецца з-пад бацькоўскага нагляду, дык — як калісь Адам з Евай — рвецца да забароненых пладоў пазнання. І да любых подзвігаў, якія даказвалі б фізічную дасканаласць герояў.

Дома нельга вырываць дзвярных ці аконных створак з вушакоў, але ў безнагляднай чыгуначнай пачакальні спакусу, каб выпрабаваць маладую сілу, можна здзейсніць. Дома нельга брыдкасловіць па сценах і між імі, але ў пачакальні, куды не сягаюць бацькоўскія вока і вуха, можна гэты забаронены яблык спрабаваць. Дома нельга занадта цікавіцца тайнамі другога полу... і г.д.

У арэшкаўскай пачакальні акно і дзверы зеўраюць адсутнасцю ўсіх створак, на сценах брыдкаслоўе. Мала таго — малады век характарызуецца неадольнай прагай да ведаў, да спажывання пладоў пазнання. І ў чыгуначным будынку маладыя людзі — думаю, што гэта толькі яны — правялі своеасаблівыя майстар-класы па вывучэнню будаўнічай канструкцыі, прабуючы разабрацца ў некаторых сценах. Цяпер відаць, што будынак на чыгуначным прыпынку ў Арэшкаве пабудаваны на аснове каркаса з чатырохдзюймавых брусоў; каркас абабіты дошкамі, на якія быў пакладзены тынк...

Ці здабытыя такім пазаўрочным спосабам веды спатрэбяцца маладым людзям у далейшым жыцці? Цалкам верагодна, што так. Магчыма ж, што ім у будучыні давядзецца сабе пабудаваць нейкі дом; канструкцыйныя прыёмы не змяніліся, мяняюцца найчасцей толькі матэрыялы — у нашым выпадку заміж дошак зараз прымяняюцца панэлі з іншых рэчываў. Варта пры нагодзе заўважыць, што такія вучні, якія саматужна здабываюць веды па-за школай, пазней няблага спраўляюцца з выклікамі дарослага жыцця.

Пачакальня пад дахам у Арэшкаве ў выніку даследчых практыкаванняў маладых людзей не надта зараз прыгодная для пасажырскага ўжытку. Але чыгуначнікі падумалі пра гэта і прапануюць альтэрнатыўную пачакальню, пад адкрытым небам, на пероне, пабудаваную з дзвюх шпалаў на падпорках. Тут канструкцыя нескладаная, не выклікала пакуль патрэбы дэталёвага даследавання і — яшчэ трымаецца.

У Гайнаўку заязджаю на рэйбусе (rail bus). З вакзала кіруюся ў горад, на кладку-віядук. Перад усходкамі буйная калюжына, якую можна абмінуць толькі моцна чапляючыся парэнчаў або рызыкуючы небяспечны скачок у даўжыню. І зноў спорт — гімнастыка або лёгкая атлетыка; адным словам — фізкультура. А фізічная культура здаўна была сродкам умацавання здароўя чалавека. Як падкрэслівала Праграма КПСС ад 1961 года, яна — як здабытак народа — з'яўляецца важным сродкам „выхавання новага чалавека, які гарманічна спалучае ў сабе духоўнае багацце, маральную чыстату і фізічную дасканаласць".

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Чаромхаўская культура

У 29 н-ры „Нівы” ад 22 ліпеня друкавалася размова Аляксандра Вярбіцкага з дырэктарам Гміннага асяродка культуры ў Чаромсе Барбарай Кузуб-Самасюк на тэму дзейнасці згаданага цэнтра. Не падважаю верагоднасці даных, запісаных у тэксце, але, на маю думку, на культуру складаецца нешта больш чым арганізаванне культурных мерапрыемстваў ці чытанне кніжак. Аб культуры лакальнай грамадскасці сведчаць таксама міжлюдскія суадносіны, талерантнасць на паталагічныя хібы, пашана грамадскай маёмасці ці вонкавы выгляд мясціны. Гэтыя апошнія справы напэўна ўплываюць на імідж гміны. Народная мудрасць кажа: „Як нас бачаць, так пра нас пішуць”. А як справы ў Чаромсе маюцца? Гляньма для прыкладу на чыгуначную станцыю. На перонах непрыбраны адпады паламанага галля, а нават сухога лісця пасля зімы. У вазонах, дзе павінны расці кветкі, парастае пустазелле. Пры ўваходзе ў пачакальню, на пляцоўцы, паламаныя лаўкі для сядзення. Дошкі жыўцом вырваны з бетоннага замацавання. Разумеецца, што гэтага не зрабіў дарослы чалавек, але хуліган-падростак. Можна затым паставіць пытанне: дзе былі чыгуначныя органы правапарадку — службы аховы чыгункі, паліцыі ці пагранічнай стражы? Дзе былі дарослыя жыхары, распаложаных ля станцыі сядзіб? Няўжо ж ніхто заганнага не прыкмеціў у паводзінах збіраючыхся каля станцыі штовечар каскадзёраў на матацыклах? А хто пры лавачках пакідае гурбы шалупіння ад сланечніка? Няўжо з дажджом паспадалі яны з неба? Спадзяюся, што справай павінны пацікавіцца перад усім адказныя за станцыю кіраўнікі Прадпрыемства рэгіянальнай перавозкі ў Беластоку, як і органы правапарадку. Няўжо яны карыстаюцца народнай прымаўкай: „Нічога не знаю, бо жыву з краю”.

(ус)

Як ездзяць аўтобусы ПКС?

Калі прыйшло лета, то аўтобусы беластоцкага ПКС (іх адрас: вул. Фабрычная, 1) на лініі Беласток — Міхалова — Нараўка — Гайнаўка пачалі ездзіць як ім хочацца.

Вось прыклады. 28 ліпеня і 19 жніўня г.г. не паехалі аўтобусы ПКС з Гайнаўкі ў Беласток цераз Ляўкова а гадзіне 15.24. Чаму? Пра гэта нідзе не спытаеш. На гайнаўскім вакзале ПКС і ПКП закрылі нават касу, у якой прадавалі аўтобусныя білеты.

19 жніўня г.г. не было аўтобусаў ПКС, якія ад’язджаюць з Беластока ў Гайнаўку цераз Ляўкова а гадзіне 10.00 і 12.40. Іх дарма чакалі пасажыры ў Новым Ляўкове. Адсюль у Гайнаўку яны адпраўляюцца а гадзіне 11.33 і 14.07.

Варта дадаць, што дагэтуль ПКС памяняў расклады язды аўтобусаў на актуальныя толькі на вакзале ў Гайнаўцы 31 ліпеня г.г. — на ўсіх тамашніх трох перонах. Каб наклеіць новыя на прыпынках ПКС у вёсках, ён не паклапаціўся.

(мох)

Стаўка на масавы спорт

Размова са Славамірам ЧЫКВІНЫМ — дырэктарам Асяродка спорту і рэкрэацыі ў Гайнаўцы, шматгадовым настаўнікам інфарматыкі ў Гайнаўскім белліцэі.

— ***У час канікулаў асяродак ладзіў многа спартыўных мерапрыемстваў накіраваных да дзетак і моладзі. На якія гульні Вы звярнулі найбольш увагі?***

— Мы зрабілі пляцоўку, прыстасаваную да пляжных спаборніцтваў і наладзілі на ёй масавыя гульні для дзетак і моладзі, якія выдатна спрычыняюцца да развіцця іх фізічнай формы. Арганізавалі мы на гэтай пляцоўцы футбольныя і валейбольныя спаборніцтвы для вучняў падставовых школ і гімназій, а пасля па гэтых відах спорту вяліся адкрытыя змаганні для астатняй моладзі і гульні паміж жыхарамі паасобных кварталаў горада. Арганізавалі мы веласіпедныя вандроўкі па Белавежскай пушчы і яе наваколлі. Паставілі мы на масавы спорт і ўдзельнікаў нашых мерапрыемстваў, дзетак і моладзь, трэба лічыць у сотнях асоб.

— ***Ці будуць яшчэ ладзіцца гульні для школьных каманд?***

— У бліжэйшы час хочам наладзіць баскетбольныя гульні ў гарадскім скейтпарку, а ў ходзе школьнага года прадбачваем крос-паход для вучняў ды шмат міжшкольных спартыўных мерапрыемстваў. Рашыліся мы падводзіць вынікі, якіх будуць дабівацца паасобныя школы, каб больш актывізаваць іх да ўдзелу ў нашых мерапрыемствах. Мая мара — наладзіць байдарачныя паходы па Нарве або Нараўцы. У асноўным спартыўны рыштунак для гэтага ў нашым асяродку ёсць, аднак трэба яшчэ камплектаваць для яго абсталяванне.

— ***Старэйшыя жыхары Гайнаўкі больш масава выступаюць у якасці балельшчыкаў на футбольных або валейбольных матчах. Вы прапануеце ім актыўны адпачынак.***

— Мы наладзілі спаборніцтвы па пляжным футболе для каманд паасобных гайнаўскіх прадпрыемстваў, а ў выпадку пляжнага валейбола арганізавалі адкрыты турнір. Замест за вялікія сродкі ладзіць агульнапольскі валейбольны турнір, мы паставілі на спаборніцтвы для жыхароў Гайнаўкі і наваколля, на якія выдаткавалі невялікія грошы. Раней жыхары Гайнаўшчыны гулялі ў пінг-понг і тэніс. Значным мерапрыемствам, у якім прыняло ўдзел шмат дарослых асоб, быў майскі марафон з Белавежы ў Гайнаўку на дыстанцыі напалову карацейшай за традыцыйную.

— ***Вялікім спартыўным здарэннем было таксама спаборніцтва наладжанае ў пачатку жніўня для інвалідаў.***

— Арганізатарам гэтага мерапрыемства быў Гайнаўскі дом культуры, а мы выступілі толькі суарганізатарам спаборніцтваў, якія праходзілі на нашай пляцоўцы. Асобы з фізічнай абмежаванасцю змагаліся па лёгкай атлетыцы. Апрача нашых спартсменаў у гонках прынялі ўдзел прадстаўнікі Беларусі і Украіны. Побач асноўных змаганняў разыграны былі матчы па футболе і пляжным валейболе, у якіх прынялі ўдзел між іншым каманды з Пружан.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

— ***Ці ў іншых спаборніцтвах таксама прымаюць удзел спартсмены з Беларусі?***

— У марафоне з Белавежы ў Гайнаўку ўдзельнічалі два спартсмены з Беларусі. На пляжныя спаборніцтвы мелі прыехаць валейбалісты з Беларусі, але не даехалі. Атрымаўшы візы, не паспелі яны прайсці ўсіх працэдур, якія ў Рэспубліцы Беларусь папярэджваюць выезд на замежныя спаборніцтвы. Прадбачваем, што 22 верасня спартсмены з Беларусі прыедуць на бег па вуліцах горада за кубак бурмістра Гайнаўкі. Разважалі мы трансфер валейбалістаў з Беларусі ў наш клуб „Пронар Паркет Гайнаўка”, але кошты здзелкі з замежнымі ігракамі аказаліся надта высокімі, а і ўтрыманне замежных валейбалістаў таксама вышэйшае, чым айчынных ігракоў, таму мы і адмовіліся ад гэтай задумы.

— ***Нядаўна ў Вашым асяродку закончыліся рамонтныя работы на адкрытым басейне. Ці праводзяцца на ім ужо спаборніцтвы па плаванню?***

— Мы перарабілі басейн з алімпійскага на рэкрэацыйны. Зрабілі яго больш плыткім, бяспечным і прыстасаваным да шматлікіх гульняў. Зараз інструктары вучаць на ім дзетак і моладзь плаванню, а ў бліжэйшы час будзем ладзіць спаборніцтвы.

— ***На Вашай футбольнай пляцоўцы нядаўна праходзілі святкаванні 70-годдзя мясцовага спартыўнага клуба „Пушча”. Ці прадбачваеце рэалізаваць нейкія інвестыцыі ў інфраструктуру, якой карыстаецца „Пушча”?***

— Зараз мурава на футбольнай пляцоўцы вельмі добрай якасці. У першую чаргу трэба было б рамантаваць месцы для сядзення і агароджу вакол пляцоўкі. Добра было б мадэрнізаваць таксама інфраструктуру для лёгкаатлетычных спаборніцтваў. Пасля, канешне, можна было б пакласці новую штучную мураву.

— ***Уласнікам валейбольнага клуба „Пронар Паркет Гайнаўка”, які іграў у першай лізе, быў Ваш асяродак. Нядаўна было створана аб’яднанне „Валейбольны спартыўны клуб Гайнаўка”, спецыяльна заснаванае для кіравання клубам. Ці такія змены могуць паправіць фінансавае становішча клуба, які цяпер будзе выступаць ужо ў другой лізе?***

— Новастворанае аб’яднанне будзе мець большыя магчымасці здабываць сродкі для клуба. У гэтым годзе на дзейнасць валейбольнага клуба мы атрымалі 200 тысяч злотых з гарадскога бюджэту, астатнія сродкі перадаюць нам нашы спонсары. Я аб’ездзіў ужо ўсе прадпрыемствы Гайнаўкі і многія на Гайнаўшчыне, прапануючы фірмам рэкламу ўзамен за фінансавую падтрымку валейбалістаў.

— ***На сесіі Гарадской рады прагучала інфармацыя аб намеры пабудаваць на тэрыторыі Вашага асяродка невялікі спартыўны комплекс з заламі для трэніровак і адміністрацыйнымі памяшканнямі. Калі можа распачацца рэалізацыя такой задумы?***

— Прадбачваецца, што ў наступным годзе распачнецца будова спартыўнага комплексу з заламі для трэніровак і біялагічнага аднаўлення. Апрача адміністрацыйных памяшканняў будзе ў гэтым комплексе гасцінічная частка на 40 або нават і больш месцаў.

— ***Ужо другі год у Гайнаўцы будуецца крыты басейн. Калі закончыцца гэтая будова?***

— Прадбачваецца, што ў гэтым годзе будынак з басейнам будзе прыкрыты і распачнуцца аддзелачныя работы. Аднак не ведаю як доўга будзе рэалізавацца гэтая інвестыцыя.

— ***У скейтпарку па вуліцы Якуба Коласа моладзь адпачывала днём, але здаралася, што наведвала яго і ноччу, ужо нелегальна. Ці ўдалося ўціхамірыць маладых людзей, якія праз пашкоджаную агароджу ўваходзілі на спартыўную пляцоўку, каб там пагуляць?***

— У скейтпарку зараз пастаўлена тэлекамера, якая кругласутачна рэгіструе ўсё, што адбываецца на яго тэрыторыі. Цяпер моладзь гуляе ў скейтпарку толькі днём. Катаецца яна на роліках і спартыўных веласіпедах, гуляе ў баскетбол і тэніс.

— ***Вы здаўна працуеце настаўнікам інфарматыкі і тэхнікі ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. Ці многія белгімназісты і белліцэісты прымалі ўдзел у спаборніцтвах арганізаваных Вашым асяродкам?***

— Шмат гімназістаў і ліцэістаў удзельнічала ў нашых спаборніцтвах, а асабліва па пляжным і звычайным валейболе. Выпускнік белгімназіі Данель Сачко паспяхова выступаў у нашым клубе „Пронар Паркет Гайнаўка”, які змагаўся ў першай лізе.

— ***Дзякую за размову.***

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

Свята ў беларускім засценку (5)

(пачатак у 31 н-ры)

Водар малой Радзімы, а гэта Вашунава, заўсёды ў маім сэрцы. Ціхая, крывенькая вулачка, матчын садок са смачнымі яблыкамі, чыгунка, лес, поле — усё тут міла і прыгожа,* — піша Юры Гіль.

Калі мы пераязджалі цераз вёскі Докшыччыны, у вочы кідалася іх татальнае адміранне. Хаткі з забітымі вокнамі патаналі ў лесе чарнобылю, лапухоў і крапівы. З гэтым вобразам жыва кантраставаў выгляд могілак, дагледжаных і ўпрыгожаных морам штучных і жывых кветак. Выглядала так, што кантакт між старым вясковым і новым гарадскім светамі парваны толькі ў фізічным сэнсе. І што справа рэальных паваротаў — хай сабе на час летняга сезона — рэальная. Хоць, як паказаў прыклад Юры Гіля, у зваротнай дарозе чакаюць пякельныя перашкоды.

Сёння ў Засцянковай хатцы забітыя дошкамі вокны. Крыжы і святыя фігуры выконваюць ролю сімвалаў-ахоўнікаў. Восеню 1999 года кіраўніцтва калгаса „Чырвоны сцяг" рашыла брутальна выдварыць гаспадара з бацькоўскай хаты...

* * *

Гэта здарылася 28 верасня, дзень пасля праваслаўнага свята Уздзвіжання. Юры Гіль паставіў трэці крыж перад хаткай-музеем. На другі дзень, з дапамогай знаёмых, парадкаваў магілы дзядоў у Свірках. І калі вечарам, пешкі, вяртаўся дамоў, 200 крокаў ад Вашунава яго дагнаў самаход. Усярэдзіне сядзелі тагачасны старшыня калгаса і галоўны аграном. Калгасная вярхушка нечакана накінулася з крыкам:

— Дакументы! Лабус! Літоўскі фашыст! Ты не павінен сюды прыязджаць! Мы тут гаспадары!

Юры Гіль з пляменнікам Андрэем Верамейчыкам

Пад напорам штурму дзверы музея абрынуліся на падлогу. Нахалы патапталі абраз Фацімскай Божай Маці і партрэт рымскага папы Яна Паўлы II, якія віселі на дзвярах. Першыя пабоі атрымаў ні ў чым невінаваты Мяховіч. Неўзабаве агрэсары на гарышчы знайшлі і гаспадара. Адразу сталі яны біць нагамі па ўсім целе. Пасля вывалаклі на вуліцу і запхнулі ў сваю машыну. Юры Гіль згубіў акуляры ды нават не ведаў дзе і куды вазілі яго калгасныя царыкі (да старшыні і эканома далучыў яшчэ мясцовы ўчастковы). У пэўны момант закінулі яны ахвяры на шыю вяроўку і сталі душыць:

— Знішчым цябе і спалім тваю хату! — крычалі...

— Тады здарыўся першы цуд, — успамінае Юры Гіль, — нечакана,

З гэткімі выкрыкамі калгасныя царыкі пачалі яго збіваць і запіхаць у машыну. Ашарашаны Юры Гіль неяк адбіўся ад захопнікаў і адбег ад дарогі ў поле. Машына развярнулася і паімчала некуды ў бок вёскі Лайкова...

Спачатку Юры Гіль зайшоў да суседа Антона Мяховіча і распавёў пра здарэнне. Раней, увесь дзень яны супольна працавалі на могілках. Зараз мужчыны рашылі разам ісці ў Засцянковую хатку. Не мінула і сорак хвілін як ля хаты затармазіла машына, пачуліся стрэлы і сакавіты рускі мат. Няпрошаныя госці сталі дабівацца да дзвярэй і патрабавалі адкрыць хату. Замест таго Юры Гіль адключыў святло і выкруціў пробкі ад лічыльніка. лопнула вяроўка. Гэта здзівіла не толькі яго, але і мучыцеляў: — *Во які дужы!* — паўтаралі тыя.

* * *

Кашмар цягнуўся чацвёра сутак. Спачатку Юры Гіля завезлі ў Докшыцы. Па дарозе яму гразілі, што заб'юць, калі скажа некаму праўду. Цэлага ў крыві прывезлі на экспертызу ў бальніцу хуткай дапамогі. Прымусілі дзьмуць у трубку, даказвалі, што нібыта ён вадзіцель. Медыкі паслухмяна выканалі загад „калгаснай тройкі". Добра, што дазволілі пазваніць сястры ў Крулеўшчызну. Юры Гіль паведаміў яе, што знаходзіцца пад арыштам, што яго хата разгромленая, а ён сам увесь збіты. Тады ўчастковы вырваў трубку з рук... Юры Гіля вывелі ў калідор і сталі збіваць, крычалі, каб не гаварыў лішняга...

Пасля павезлі ў Раённае аддзяленне ўнутраных спраў. Там абшукалі, забралі грошы, рэмень і павялі ў камеру. У цеснай і смярдзючай камеры сядзела разам сем чалавек. Апрача смуроду дакучаў холад...

Суд адбыўся ўжо на другі дзень. У якасці сведкаў выступілі калгасныя бонзы — учарашнія мучыцелі. „Тройка" завяла падсуднага ў кабінет знаёмай суддзі, якая Ю. Гіля адразу сустрэла непрыхільна. Адмовілі яму ў адвакаце, праігнаравалі просьбу, каб звязацца з літоўскім пасольствам у Мінску (Юры Гіль — грамадзянін Літвы) ды праслухаць сапраўднага сведку здарэння Антона Мяховіча. Суддзя груба забараніла карыстацца беларускай мовай. А свой прыгавор — 7 сутак зняволення, падвяла такімі словамі:

— *Ничего к нам приезжать и без дела болтаться!*

За побыт у турме трэба было заплаціць 200 тысяч рублёў у суткі (100 долараў). Частку платы ўзялі без ведама зняволенага, проста канфіскавалі ўсе знойдзеныя ў кішэні грошы...

Юры Гіля ўвесь час падтрымоўвала на духу сям'я. Дзякуючы руплівасці сястры, была зроблена новая экспертыза, быў праведзены агляд пацярпелай хаты ды апрошаны сапраўдны сведка здарэння. На чацвёрты дзень тая сама суддзя загадала выпусціць арыштаванага на волю. Без ніякага тлумачэння, быццам нічога не здарылася.

* * *

Сёння Юры Гіль дапамагае ахвярам палітычных рэпрэсій. На пытанне пра прычыну пабояў у Засцянковай хатцы няма адназначага адказу. Магчыма, што пайшло пра зямлю. Справа ў тым, што Вашунава ўпадабалі сабе тагачасныя калгасныя бонзы. Тут ладзілі банкеты, рыбалкі, п'яныя оргіі.

— А ці шукалі вы пасля справядлівасці па судах? — спытала я.

— А навошта мне рукі пэцкаць, — адказаў гаспадар. — Іх сам Бог ужо пакараў. Карацей, хоць Юры Гіль не кіўнуў пальцам, уся „тройка" трапіла за краты...

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

** У тэксце скарыстаныя фрагменты кніжкі Юрася Пятрусёва „Засцянковая хатка", Вільня 2006.*

Арлянскія сустрэчы

Сёлета Орля адзначае 500-гадовы юбілей. З гэтай нагоды ў верасні адбудуцца юбілейныя мерапрыемствы, арганізаваныя войтам Арлянскай гміны пры садзеянні Гміннага асяродка культуры і Таварыства прыяцеляў Арлянскай зямлі.

2 верасня 2007 года а гадз. 14^{00} у Орлі на пляцы перад сінагогай распачнецца фэст беларускай культуры „Арлянскія сустрэчы", у ходзе якога сваё майстэрства прадэманструюць самадзейныя і эстрадныя калектывы. Гаспадароў прадстаўляць будуць калектывы, якія дзейнічаюць пры Гмінным асяродку культуры: „Арляне", „Арлянскія званочкі", „Фермата" і „Малінкі" з Маліннік. Гасцінна выступяць самадзейны калектыў „Чыжавяне" з Чыжоў, эстрадныя гурты „Маланка", „Прымакі", „Ас", „Omen", фальклорны калектыў „Фэст" з Беларусі і Алена Руткоўская.

Фэсту беларускай культуры спадарожнічаць будуць выставы рукадзелля, карцін Анатоля Краўчука з Крывой, паказы майстэрства дзюдаістаў, выратавальна-тушыльнага абсталявання, дрэсіроўкі сабак, а таксама конкурсы для публікі. Інфармацыйныя стэнды аб сваёй дзейнасці пакажуць КРУС, Асяродак сельскагаспадарчай кансультацыі, Хуткая дапамога, Павятовая камендатура паліцыі і Гранічная ахова.

Мерапрыемства занончыцца паказам феерверкаў (гадз. 20^{00}) і танцамі (гадз. 20-24).

22 верасня 2007 г. а гадз. 17^{00} у сінагозе ў Орлі адкрыецца выстава „На фоне сінагогі", прысвечаная гісторыі арлянскіх яўрэяў.

23 верасня 2007 г. а гадз. 14^{00} у мясцовым Комплексе школ з беларускай мовай навучання адбудзецца навуковы семінар „500 гадоў Орлі — суіснаванне культур". Мерапрыемства папярэдзяць літургія ў Свята-Міхайлаўскай царкве ў Орлі, якую ўзначаліць мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава (пачатак а гадз. 10^{00}) ды малебен і асвячэнне мемарыяльнага крыжа (11^{30}), устаноўленага прыватнымі спонсарамі.

Брама

Перад колішнім школьным будынкам у Старым Ляўкове (Гайнаўскі павет) стаіць вялікая драўляная брама з дашкам пакрытым гонтай. Гэтыя вароты на тоўстых чатырох слупах можна лічыць помнікам старадаўнасці. Зараз ніколі не рамантаваны дашак пападае ў руіну.

Брама з'яўляецца арыгінальным архітэктурным аб'ектам у Старым Ляўкове. Жыве яна ў памяці выпускнікоў мясцовай школы. Браму з дашкам неабходна адрамантаваць. Хочуць гэтага жыхары Старога Ляўкова (выказаліся за гэта на вясковым сходзе), Новага Ляўкова і Плянты. Хадайнічаюць аб гэтым радныя Янка Целушэцкі і Юры Равінскі. Яны ставілі справу на сесіі Гміннай рады ў Нараўцы.

Драўляную браму (мела яна да 1970 года драўляныя арыгінальныя вароты) адмаўляецца рамантаваць толькі войт Нараўчанскай гміны. Прапанаваў ён нават раднаму разабраць яе і тады знікла б праблема. Адзін з ранейшых адказаў на прапанову жыхара Новага Ляўкова, але тады яшчэ не раднага, быў такі, што няма спецыяліста па пракладцы гонты. Адказы пана войта былі розныя. Шкада, што справа зайшла ў тупік, а брама з кожным годам пападае ў руіну.

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Новыя праекты і сюрпрызы „Зоркі”!

Каму добра — таму добра! Нам таксама нядрэнна — неўзабаве пойдзем у школу. З новым камплектам кніжак, з новымі марамі, спадзяваннямі. Зноў пачнуцца абавязкі, праца, задачы. Асабліва цяжкі выклік чакае вучняў апошніх класаў. Трэба пастарацца, каб на пасведчанні былі бліскучыя вынікі. Каб далей ісці ў пажаданым напрамку, дастацца ў добры ліцэй, тэхнікум, каледж, гімназію. Самі часта пытаецце: як гэтага дасягнуць? У мяне заўсёды адна рада: каб падтрымаць працу галавы... неабходна чытаць. Як паказала практыка, ніякія энцыклапедыі, падарожжы, Інтэрнэт не могуць раўняцца з кніжкай. Ідзе пра жывы працэс мыслення і адчування, крытычны погляд на тое, што бачым і робім. Праўда, не заўсёды школа ставіць перад намі высокія патрабаванні. Найчасцей узровень навучання зводзіцца да агульных магчымасцей вучняў. І што тады рабіць амбітным і прадпрымальным адзінкам? У апошнім выпадку астаецца адно — самаадукацыя. Значыць, чытанне кніжак. Трэба вам ведаць, што свет не канчаецца на нашым горадзе ці вёсцы. Свет зараз адкрыты. Многія з вас паедуць вучыцца ў замежжа, магчыма, што астануцца там жыць і працаваць...

Пасля доўгага перапынку многія з вас зноў заглянуць у „Зорку”. І тут — сюрпрыз! У летнюю пару мы не забывалі пра верных чытачоў. Дзеля малеч мы друкавалі белавежскія гісторыі пра звяркоў і людзей. Моладзі мы падрыхтавалі „канікульную” версію „Мухі ціп-топ!” і нягжэчнарамантычныя гісторыі Дзядзечкі Сіда. Варта пагартаць архіўныя нумары „Зоркі” ў бібліятэцы — будзе многа радасці і навукі.

А што чакае нашых чытачоў у новым навучальным 2007/2008 годзе? З верасня пачнем друкаваць у адрэзках прыгодніцкі раман пра жыццё гімназістаў — у літаратурнай і карцінкавай версіі. Маем таксама новы праект рубрыкі „Галерэя Зоркі”. Будуць рэпартажы са школ і вашых святаў. Будзе шмат конкурсаў і многа-многа цэнных узнагарод. Пастаянным чытачам мы падрыхтавалі таксама сюрпрызы (як дадатак да газеты). І найважнейшае — ёсць надзея на тое, што з новага года „Зорка” стане каляровай!

ЗОРКА

Вершы Віктара Шведа

Чаму выйшла за старога?

— Калі была калісьці гэткай,
Як ты, унучанька, таксама,
Пакахала твайго дзедку
І неўзабаве выйшла замуж.

— А ці ты, мая бабуля,
Выйсці замуж не павінна
Не за старэнькага дзядулю,
А за малодшага мужчыну?

Спачуванне

Настаўнік узяў аднекуль
І раптам дзяцей пытае:
— Што можна даць чалавеку,
Які дасло́ўна ўсё мае?

Што адказаць? Невядома.
Азваўся дасціпны Ваня:
— Я чалавеку такому
Магу прысвяціць спачуванне.

Фота Адама ПАЎЛОЎСКАГА

Няма як добра пад’есць у Нюты

Белавежскія расказы

ДЗЕД МАРОЗ ДАПАМАГАЕ ПТУШКАМ

Студэнтка беларускага педагагічнага універсітэта Таццяна Патапчук з прыпушчанскай вёскі Беразнякі не магла падумаць, што нейкі час летам на канікулах ёй прыйдзецца выконваць ролю доктара. Неяк раніцай, ідучы на ферму, дзе працуе яе маці, Таня ўбачыла адзінокага бусла з апушчаным крылом. Птушка была паранена аб высакавольтку і магла стаць лёгкай здабычай сабак ці драпежнікаў. Бусел у рукі не даваўся і балюча біў дзяўчыну сваім доўгім дзюбаком па руках. Але яна на птушку не крыўдуе, разумее, што кожны бароніць сябе, як умее.

Ратаваць бусла дапамагала Таня ўся сям’я. Разам з сястрой яны лавілі на лузе далікатэс французскіх гурманаў — жаб. Прыйшлося таксама засвойваць сакрэты рыбнай лоўлі. Маці за абедам адкладвала для Боці лепшыя кусочкі мяса. А бацька патэлефанаваў у Белавежскую пушчу навукоўцам і расказаў аб параненай птушцы. Калі работнікі Нацыянальнага парку прыехалі забіраць бусла, ён сустрэў гасцей насцярожана, але ў хуткім часе Боця засвойваў новую тэрыторыю — памесце Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы, аб якім расказвала газета Ніва”.

Чыстая вада сажалак і мноства жаб у сакавітай траве прыйшлося даспадобы буслу-вандроўніку. Турысты з цікавасцю пазіралі, ці не драўляную часам скульптуру выдаюць ім за сапраўднага жывога бусла. Раней такога суседства птушкі з зубрамі ніколі не бачылі. Але, пачуўшы самотную гісторыю Боці, кожны добры чалавек пранікаецца ў думках пачуццём жалю да параненай птушкі і жадае, каб бусел хутчэй стаў на крыло і паляцеў са сваімі суродзічамі ў цёплыя краіны. Добры Дзед Мароз любіць звяроў і птушак. Разам са сваімі дасціпнымі памочнікамі Лесавічком і Лясной феяй ён неаднойчы дапамог жывым істотам у бядзе. Спадзяемся, што не будзе выключэннем і наш Боця, і неўзабаве ён узляціць над пушчай і развітаецца з намі да вясны.

Таіса СКУРАТАВА, в. Камянюкі

Буслы

Мама бусліха з буслам татам
З тройкай сваіх буслянят
Пакідаюць нашу хату
І ў вырай далёкі ляцяць.

Ды маладым буслянятам,
Што між іншых не пазнаць
(Перараслі ж маму і тату!) —
Свет далёкі — чужына.

Ды ж усіх буслоў радзіма,
Дзе ад яйка параслі —
Усё ж тутэйшая краіна,
Найбольш родны кут зямлі.

Міра ЛУКША

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

Гардкор-2007
або Муха ціп-топ на канікулах
— 8 —

Я не люблю Дароту Шакальскую, дачку дырэктара лагера. Дзяўчына робіць усё, каб знеахвоціць да мяне хлопцаў з нашай групы. Усе здагадаліся, што Дароце падабаецца Пеця. На жаль, хлапец не глядзеў у яе бок, а толькі быў захоплены мною! Дачка „Шакалаў" прыдумвала гідкія гісторыі пра мяне, хоць ніхто ёй не верыў. Я махнула рукой на яе інтрыгі. Паводзіны гэтай дзяўчыны выклікалі адно шчырыя спачуванні і кпіны. Калі праз хату прабег пацук (а гэта здаралася часта), яна з плачам ляцела паскардзіцца маме.

— Чаму яе ўвапхнулі ў нашу групу? — спытаў Пеця.

— Пэўна таму, што яе бацька — наш апякун і хоча мець дзеўку на воку, — меркаваў Ілья.

— І навошта яна сюды прыехала? — нерваваўся Пеця.

— Думаю, што бацькі баяліся пакінуць яе адну ў хаце або пашкадавалі грошай на нейкі нармальны летнік!

— Мне хацелася б, каб Дарота хоць на дзень знікла з нашай групы! — аддаўся марам Пеця.

— Гэта, здаецца, немагчыма, — я суцяшала сябру.

— А каб насыпаць ёй у гарбату снатворнага парашку? — прапанаваў Ілья.

— Супер думка! — падхапіў Пеця.

— Можам таксама пачаставаць ім „Шакалаў" і Ляскоўскага, — дакінуў Янка.

— Толькі адкуль мы возьмем такі парашок? — спытала я.

— Ты не хвалюйся, — падміргнуў мне Ілья, — я маю з сабой аж чатыры пакеты.

— Ну і будзе цырк! — уцешылася я.

— А калі мы здзейснім наш план? — спытаў Янка.

— Яшчэ да вячэры, калі дзяжурныя паставяць на стол кубкі.

Пеця, Ілья і Янка зрабілі так, як задумалі. Марыета і Дарота Шакальскія выпілі сваю гарбату нагбом, аднак Генік Ляскоўскі і Генадзь Шакальскі нават не дакрануліся да кубкаў.

— Мы змарнавалі толькі парашок, — хваляваўся Пеця.

— Супакойся, — я прыгадала словы Касі, — Шакальскі з Ляскоўскім кожны вечар ідуць у бар. Яны нас не заўважаць!

— Файна-файна! — Пеця пляснуў у далоні ад радасці. — Хай яны сабе ідуць! Мы таксама пойдзем павесяліцца!

У адзінаццаць вечара група № 3 ужо танчыла на дыскатэцы ў Смальніцы. У святліцы было шмат моладзі. Прыйшлі таксама старэйшыя дзядзькі, якія пілі піва і падчаплялі прыезджых дзяўчат. Міколка ўсю дыскатэку танцаваў з мясцовай прыгажуняй. Нават мяне не заўважыў. Ілья і Янка таксама пазнаёміліся з нейкімі дзяўчатамі. А Пеця, вядома, танчыў са мной. Я была шчаслівай! Пеця мне падабаўся...

Калі ў дзве гадзіны ночы мы ўжо збіраліся вяртацца ў лагер, я пабачыла ў дзвярах Генадзя Шакальскага з нейкай дзеўкай. Ён адразу стаў танчыць і туліцца як закаханы.

— Ці нехта мае добры фотаапарат у мабільніку? — спытаў Пеця.

— Мы ж не маем мабільнікаў, — прыгадаў Янка.

— А я маю фотаапарат! — усміхнуўся Ілья.

— Цудоўна! Тады, хуценька здымі „Шакала", — выгукнулі мы.

Ілья зрабіў тры здымкі. Мужчына быў настолькі захоплены партнёркай, што нават не звярнуў увагі на бліскі фотаўспышкі.

У паваротнай дарозе мы ўяўлялі як успрыме апошнюю навіну спадарыня Марыета?!

Тэкст:<natasza9922@wp.pl>
Дызайн:<lolcia05@tlen.pl>

ГАЛЕРЭЯ ДЭКЛАМАТАРАЎ

Фота Ганна КАНДРАЦЮК

Анна Мар'я Янчук — Гайнаўка

Яна Латушка — Варшава

Польска-беларуская крыжаванка № 35



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 31: След, сяло, звер, сесія, роў, сінь, кола, сола, рысь, зубр, шанс, сам, ура, сад, яда, на. Зрок, рака, леў, сын, косць, соль, сіла, суд, сена, зара, Ясь, сума, лоб, оя, ікра.

СВЯТА КЕРАМІКАЎ

Усе добра гулялі

12 жніўня г.г. у Старым Ляўкове (Гайнаўскі павет) плылі прыгожыя беларускія песні. Стаяла адна з летніх ласкавых, сонечных ды цёплых нядзеляў. Кіраўніцтва мясцовай керамічнай фабрыкі і Гмінны асяродак культуры ў Нараўцы арганізавалі святкаванне Дня керамікаў ды народны беларускі фэст у тамашнім амфітэатры. Такога роду мерапрыемства адбываецца традыцыйна кожны год. І кожны тут знойдзе штосьці для сябе.

Як мерапрыемства керамікаў, то і конкурсы звязаныя з глінай. Вяла іх вопытная інструктарка Вольга Максімюк з Новага Ляўкова. Ахвотных рэзьбіць у гліне было шмат. На ганчарным коле выконвалі яны гаршкі, збаночкі і попельніцы. За кола сядалі і ўпершыню прабавалі выконваць розны посуд м.інш. радны Нараўчанскай гміны ды дацэнт Брэсцкага Політэхнічнага інстытута (Беларусь).

Ужо з самой раніцы адбыўся конкурс вудзільшчыкаў (рыбаловаў) на ставах, у месцы гліняных кар'ераў. Затым прайшоў валейбольны турнір ды перацягванне каната. Пераможцы атрымалі атракцыйныя рэчавыя ўзнагароды. Дадайма, што кіраўніцтва фабрыкі не пашкадавала грошай на ўзнагароды.

Перад мастацкай часткай а 15 гадзіне ўсіх прывітаў і зычыў добрага настрою старшыня суполкі „Будаўнічая кераміка Ляўкова" Аляксандр Бандарук. На мерапрыемства прыехалі генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Міхал Аляксейчык і намеснік маршалка Падляшскага ваяводскага сейміка Мікалай Яноўскі.

— Гэты фэст з'яўляецца падзякай для нашага рабочага калектыву, які налічвае 170 чалавек, за яго заангажаванне, умеласць і вопыт, — сказаў А. Бандарук.

Затым на сцэне запрэзентавалася дзевяць вакальна-музычных калектываў, у тым ліку народны ансамбль „Радзімічы" з Мінска (Беларусь). Першымі на сцэну выйшлі шырокавядомыя на Беласточчыне стараляўкоўскія „Цаглінкі", якія дзейнічаюць больш за 30 гадоў. Яны і „Радзімічы" („зорка" культурна-забаўляльнай імпрэзы ў Ляўкове) сваім выканаўчым майстэрствам заваражылі слухачоў. Рэпертуар іх быў багаты. Хто хацеў, дык мог купіць аўдыёкасеты з запісамі найпрыгажэйшых мелодый.

Каштоўныя ўзнагароды атрымалі пераможцы конкурсаў, м.інш. „Хто за адзін раз падыме найбольш цэглаў" (кожная з іх вагою ў 4 кг) і літаратурнага — на верш або песню аб керамічным прадпрыемстве ў Ляўкове. У конкурсе падымання цэглаў найлепшых вынікаў дабіліся спрактыкаваныя рабочыя фабрыкі — як мужчыны, так і жанчыны. У літаратурным конкурсе першае месца заняў Янка Целушэцкі, былы ніўскі журналіст, а другое — Эмілія Саўко з Мінска (Беларусь).

Вечарам пачаліся танцы пад гукі гурту „Сакрэт" з Міхалова. Працягваліся яны далёка за поўнач.

А праз год ляўкоўская керамічная фабрыка будзе святкаваць юбілей 40-годдзя свайго існавання. Дык да наступнай сустрэчы!

(мох)

Фота Ніны БРУЧКО

Уік-энд на дачы ў Цялушках

Учора ў „Wiadomościach" падалі: уік-энд будзе вельмі цёплы, на Падляшшы прадбачваецца 30 градусаў гарачыні! Нарэшце! — уцешылася я. Тады хутчэй пакідаць запылены горад і на дачу ў вёску ўцякаць, хопіць сядзець высока ў блёку, як на „бусліным гняздзе"!

Прыязджаем на месца. Сонца падышло пад поўдзень, гарачыня. Суседзяў не відаць. „Мо прачуць сена?" — падумалася мне. Разглядаюся вакол, у воддалі відаць трактар, загружаны кулямі сена, ды бабаў на сенакосе не відна, толькі сілуэт чалавека за рулём трактара. Вёсачка распалажана над самай ракой, вакол трава, трава... А бабаў у белых хустках, як бывала, не відаць. Задумваюся, у галаву лезе мінулае вёскі: поўна людзей з граблямі, віламі, коней, вазоў... і расказ мужа:

— Калі мне было шэсць годзікаў, захацелася раптам да мамы на сенакос. Пабег я над рэчку і гляджу на бабаў у белых хустках. Так іх многа і ўсе ў белых, з воддалі ўсе роўныя, ды блузачкі розныя... Разглядаюся вакол, нарэшце бачу: вось там, у чырвонай блузцы, гэта напэўна мая мама, толькі яна носіць такую прыгожую, чырвоную. Уплаў я перайшоў раку. Баяўся, вады мне пад шыю было, ды так моцна да мамы захацелася! І не памыліўся, гэта і была мая мама. А што дастаў я ад бацькоў лаянку — няважна.

Карціна памалу расплываецца. Вуліцай праехалі два трактары з сенам. Бывала, выйдзеш на лавачку, а тут воз за возам тарашчаць. Высока накладзенае сена, абвязанае вакол вяроўкамі і прыдушанае рублём, а конь і гаспадар, які сядзіць на высокім возе, як два прыяцелі — згодна, ляніва „сунуцца" на свой панадворак. А мо ўдасца сёння яшчэ раз „абярнуць" перад узбіраючай хмаркай, якая раптам паявілася на чыстым небе? Едучы назад з пустым возам, о, тады і бічом смагануць кабылку можна, каб паспяшыла. Толькі асцярожна, бывае наравістая, „панасіць" уздумае, як калісьці майго бацьку або суседку Маньку. А сена пахне, неверагодна пахне...

Запахацела колішнім пахам пакошаная мужам трава на маім панадворку, нат пякучая крапіва прыязнай стала.

Вечарэла. Каня і воза сёння я не ўбачыла. І хоць пару коней у вёсцы ёсць, ніхто сена імі не возіць, куды там, не быў бы гэта гаспадар. Затое часценька „жануцца" вуліцай самаходы. Гэта „гарадскія паны" спяшаюць на свае дачы ў Сітнікава, у лес. Гоняць „востра". Старыя жыхары прывыклі, уважліва ходзяць вуліцай, малых дзяцей няма. Ды ў час канікулаў — што другое, прыедуць унукі...

Раптам затрубіў самаход. Выбегла я на вуліцу, бачу — заграніччнік прадае ўсякую ўсячыну: вопратку, галошы, кветкі і што там яшчэ. Як з-пад зямлі на вуліцы паявіліся суседкі: Маруся, Ніна з Мікалаем і іншыя. Прывіталася я і таксама пачала перакідваць тавар. Спытала маладога чалавека:

— Адкуль вы, мо з Гродна?

— Не, я з Украіны, — адказаў.

Нічога больш я не купіла, адно пачак перцу. Села я ў ганку і прызадумалася. Амаль 30 а мо і больш год таму і я ездзіла з „таварамі" ў Савецкі Саюз, Румынію і Балгарыю. Ну, нібыта ў госці або паадпачываць на Чорным моры. Ды ўсе мы і ўлады таксама добра ведалі, чаго ездзяць грамадзяне за мяжу. Цяпер што іншае, не трэба прыкідвацца, пратацца ад паліцэйскіх або дарыць памады іхным жонкам. А няхай там, над Чорным морам не раз я пабывала і многа чаго ўбачыла, вось, і далёкую Сібір. На шчасце нашы дзеці і ўнукі маюць іншыя, лепшыя магчымасці, каб пабываць у свеце.

Вечарэе. Ізноў з мужам уключаем тэлевізар, слухаем навіны і глядзім прагноз надвор'я, а потым зараз жа лягаем спаць, як усе ў вёсцы. Нават устыдна вечарам паліць святло. Усюды царыць цішыня, здаровае паветра, пах драўляных хатніх сцен, сон хутка прыходзіць.

У чатыры раніцы сусед Мікалай ужо бразгае вёдрамі, даглядае кароў, свіней, курэй, а жонка Нінка пачынае варыць снеданне. Уторыць ім і другі сусед, Костак, з жонкай Марусяй. І дзе ж тут паспіш? Добра, што ноччу суседаў сабака не „звягаў", быў цацы-цацы... А шостай гадзіне ўстаю і я. Пад дзвярыма мяўкае нічыя кошачка. Ужо вынюхала, што я прыехала і зараз жа прыбегла прывітацца. Брыдзенькая, худзенькая, а якая мілая, разумная. За лета адкармлю яе, ізноў будзе шэрстка на ёй блішчэць. Кармлю кошачку, сама п'ю каву. А калі кошачка ўволю пад'есць, кладзецца ля парога ў ганку, блізенька майго крэсла і ціхенька памурквае ў падзяцы. Тады і кава мне лепш смакуе, і на душы лягчэй. Не магу абыякава глядзець на галодных, бедных катоў і сабак... Гэта ж нашы прыяцелі. Як выглядала б наша жыццё без катоў, сабак, птушак?.. У маім родным доме заўсёды былі коцікі і сабачкі. Мама вельмі клапацілася аб іх, добра карміла. Сытыя былі, аж блішчэлі.

Пад'елі мы з кошачкай і час мне ехаць у суседнюю вёску Канюкі. Яшчэ толькі трэба пабегаць басанож па расе, дзеля здароўя. Даходзіць сёмая раніцы. Маім суседзям гэта ўжо даўно дзень. Бяру веласіпед і імчуся. Сёлета едзецца па вуліцы лёгка і прыемна, бо ў вёсцы паклалі асфальт. І хоць страціла яна на старыннай красе, выгода лічыцца. Мы ўжо пакаленне „выгоды", не тое, што нашы бацькі. Мінаю, як штодзень, велізарны уніяцкі крыж у пачатку вёскі. Ніхто не ведае хто і калі яго паставіў. Пачарнелы, драўляны, спарахнелы... Здаецца — вось-вось упадзе табе на галаву. Ды не, няма патрэбы баяцца — на самым версе буслы звілі гняздо і гадуюць сваіх малечаў. Яны ведаюць, дзе бяспечна. А побач яго стаіць нізенькі мураваны праваслаўны крыжык, пастаўлены даўнімі жыхарамі вёскі. Абодва крыжы прыбраны стужкамі і кветкамі — як жа ж інакш.

Сённяшняй раніцай на лавачцы я сустрэла толькі аднаго мужчыну, паздароўкалася і накіравалася ў напрамку лесу, у адлеглую ў 3 кіламетры суседнюю вёску. Еду і любуюся прыродай. Сонейка прыемна ўжо прыгравае, паабапал дарогі красуецца высокае, буйное жыта з сінімі кветкамі па берагах загонаў. Так, то ж „дваранінэць", толькі ў маім дзяцінстве было яго гусцей у збожжы. Не раз я лазіла ў жыта па букеты, па спарыш. А вось бардовага куколю нідзе не відно, мабыць, звёўся. Толькі дзе-нідзе чырвоненькія мачкі круцяць галоўкамі на вецярку. Далей высокія, непакошаныя травы, па якіх дастойна шпацыруюць два буслы. Многа іх тут над рэчкай, вельмі многа. Еду, вецярок лагодна сцябае па твары, вакол цішыня, ніводнага чалавека — ні ў полі, ні на дарозе яго не сустрэць. Уязджаю ў лес, адразу халаднее, а паветра такое лёгенькае... Проста душа спявае. Думаю: якім прыгожым стварыў Бог свет для нас, людзей.

А вось і суседняя вёска. Даязджаю да „майго" буслінага гнязда на пачатку вёскі, тут заўсёды канчаўся мой маршрут. Буслянаткі паказваюць галоўкі, не палічыць колькі іх там — двое, трое ці больш? Вясковыя людзі кажуць: калі буслянят мала, дык сухое будзе лета, а калі больш — мокрае. Вакол электрычнага стаўба з бусліным гняздом распасціраецца поплаў, на якім пасвяцца козы — штук дзесяць, сярод іх два казлы з велізарнымі, закручанымі як рагалі, рагамі. Цудоўная карціна. Хацелася б схапіць фарбы, пэндзаль і намаляваць, а потым павесіць тую карціну ў сваім гарадскім „гняздзе" і цешыць вочы ўсю зіму, аж да наступнага лета.

(працяг будзе)

Ніна БРУЧКО

Мы не такія бедныя, як нам часам хочацца

5 жніўня беларускаму гісторыку, літаратуразнаўцу, архівісту, кандыдату гістарычных навук Віталю СКАЛАБАНУ споўнілася 60 гадоў. Напярэдадні юбілею наш карэспандэнт задаў гісторыку некалькі пытанняў.

— ***Віталь Уладзіміравіч, раскажыце нашым чытачам трохі пра сябе.***

— Нарадзіўся я 60 гадоў таму ў вёсцы Шылавічы Слонімскага раёна. Скончыў Санкт-Пецярбургскі універсітэт. Працаваў у выдавецтве „Беларуская Энцыклапедыя", намеснікам дырэктара і саветнікам Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы, намеснікам дырэктара Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны. А з 2002 года працую ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь загадчыкам аддзела публікацый і дакументаў.

— ***А што Вам памятаецца з таго часу, калі Вы жылі на Слонімшчыне?***

— У Шылавічах мой бацька-франтавік працаваў настаўнікам і дырэктарам мясцовай сямігодкі. Жылі мы ў школе. Маці працавала ў Жыровічах у сельскагаспадарчай школе. Аднойчы яна, калі была цяжарная мною, пераходзіла Шчару і правалілася ў палонку. Так што я быў яшчэ ахрышчаны Шчараю да свайго нараджэння. Добра памятаецца школа ў Шылавічах. Туды часта прывозілі са Слоніма паказваць кіно. Гэта для нас была самая вялікая радасць і падзея. Пазней маці перавялі працаваць у Ляхавічы, куды мы ўсёй сям'ёй пераехалі. Але школа ў Шылавічах, Шчара, кіно памятаюцца да сённяшніх дзён.

— ***Мусіць адсюль і пачалося Ваша знаёмства з беларускім кінематографам?***

— Можа і так. Бо я ж, як ты ведаеш, Сяргей, з'яўляюся сааўтарам сцэнарыяў дакументальна-мастацкіх фільмаў пра Цішку Гартнага, Усевалада Ігнатоўскага, Янку Купалу і іншых беларускіх дзеячаў.

— ***І п'есы добрыя пішаце.***

— Спадзяюся, што п'есу „Людвіка і Фабіян", якую я напісаў разам з Людмілай Рублеўскай, паставіць калі-небудзь Слонімскі драмтэатр.

— ***Віталь Уладзіміравіч, кожны з нас ведае, што Вы шмат зрабілі і для нашых гістарычнай і філалагічнай навук. Вы даследуеце гісторыю беларускага нацыянальнага руху, культуры XIX — пачатку XX стагоддзяў, пытанні архіваназнаўства, краязнаўства і бібліяграфіі. Калі мы ўсе Вашы цікавыя матэрыялы ўбачым пад адной вокладкай?***

— Зрабі мне за гэта вымову. Тым не менш, шмат выйшла і выходзіць з друку тое, што я рыхтую як складальнік.

— ***Імя аўтара паэмы „Тараса на Парнасе", якая вывучаецца ў школе, доўгі час лічылася невядомым. Некалькі гадоў назад Вы даказалі, што гэту паэму напісаў Канстанцін Вераніцын.***

— Яшчэ ў 1986 годзе мне ўдалося знайсці копію рукапісаў Аляксандра Рыпінскага, дзе было пазначана аўтарства „Тараса на Парнасе" і з яе дапамогай вызначыць імя аўтара паэмы. Сёння нават у школьных падручніках ужо не гаворыцца, што „Тарас на Парнасе" — твор ананімны. Яшчэ больш, вядомыя дата і месца напісання паэмы: 15 красавіка 1855 года, мястэчка Гарадок. Сёлета паэме спаўняецца 152 гады. І яшчэ знойдзена паэма Вераніцына „Два д'яўлы" (пазначана 7 красавіка 1860, Масква). Мова і рэаліі сведчаць пра несумненную сувязь „Двух д'яўлаў" з Віцебскам і прыналежнасць абедзвюх паэм аднаму аўтару — Канстанціну Вераніцыну. Знойдзена і апублікавана драматычная паэма Гераніма Марцінкевіча „Адвячорак". Таму дзіўлюся, чаму „Адвячорак" да гэтага часу ніхто не паставіў на сцэне. Выдатная рэч.

— ***2007 год для нас беларусаў — гэта год Купалы і Коласа. Што цікавае знойдзена пра іх у архівах?***

— Я падрыхтаваў кніжку „Купала і Колас, вы нас гадавалі". Сюды ўвайшлі новыя, раней невядомыя дакументы пра нашых песняроў з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, а таксама з іншых сховішчаў. Гэта будзе сенсацыйнае выданне.

— ***Да сённяшніх дзён так і не выйшла энцыклапедыя „Якуб Колас", хаця мы даўно маем энцыклапедыю „Янка Купала". Чаму так?***

— Ой, не сып мне соль на рану. А чаму не пабачыла свет энцыклапедыя „Максім Багдановіч"? Яна ж была амаль падрыхтаваная. Ды і невялікая па памерах атрымалася. Коласаўская энцыклапедыя будзе вельмі вялікая. Але праца над ёй вядзецца. Таму я найперш выдаў бы энцыклапедыю „Максім Багдановіч". І мару, калі ўсё ж і коласаўская, і энцыклапедыя, прысвечаная Багдановічу, пабачаць свет. Шчыра скажу, у нас за што не вазьміся — яшчэ шмат чаго не зроблена, не напісана.

— ***Мы, беларусы, шчаслівы народ, бо ў нас працы па гісторыі, літаратуры, культуры хопіць яшчэ на тысячу гадоў.***

— Не кажы! Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што ў нас загінулі архівы, бібліятэкі, каштоўныя дакументы і г.д. Ды не. Мы не такія бедныя, як нам часам хочацца. У нас, у Беларусі, даволі багатыя архівы. І беларускіх збораў вельмі шмат па-за межамі Беларусі ў многіх краінах свету. Трэба не спаць, а шукаць гэтыя дакументы і вяртаць іх на Бацькаўшчыну.

Гутарыў Сяргей ЧЫГРЫН

Дарогі да свабоды

Разважанні аб незалежнай цэнтральна- і ўсходнееўрапейскай культуры вяліся ў Вышэйшай прафесійнай школе ў Познані на канферэнцыі *Drogi do wolności w kulturze Europy Wschodniej w latach 1956-2006*. Якраз выйшла кніга матэрыялаў, прэзентаваных на гэтай канферэнцыі.

Кніга, як і раней канферэнцыя, трактуе аб розных формах супраціву таталітарнай сістэме: ад падпольнай прэсы, праз непадцэнзурны друк, да палітычнага гумару. У ліку аўтараў — палякі, венгры, чэхі, славакі, расіяне, немцы і беларусы. Гэта галоўным чынам сацыёлагі, палітолагі, гісторыкі і культуразнаўцы.

Рэктар школы „Кадры для Еўропы" і заадно рэдактар кнігі Багуслаў Бакула ва ўступным слове напісаў: „Мне здаецца, што без распаўсюджання каштоўнасцей незалежнай культуры, якая ўзнікае незалежна ад прэсінгу таталітарызму, і канчаткова пераможнай, якая паказвае пазітыўны, гуманітарны сімбіёз індывідуума і супольнасці — нашы дэмакратыі напэўна будуць больш убогія. Няварта прытым пападаць у празмерны пафас, ды трэба аб гэтым памятаць".

Публікацыя падзелена на шэсць раздзелаў і дадатак, якраз у якім апынулася аўтабіяграфічнае эсэ беларускага паэта, празаіка і публіцыста, аднаго з заснавальнікаў Таварыства вольных літаратараў Славаміра Адамовіча „Ліст з выгнання", напісаны ў Нарвегіі на пераломе 2005 і 2006 гадоў. Пачынаецца ён са знамянальнага сказа, які паказвае стан свядомасці і дэмакратыі (і ўсіх уяў з ёю звязаных) у Беларусі: „Я аднойчы назваў сябе беларускім паэтам і цяпер мушу за гэта плаціць. Здаецца, ужо да канца жыцця". У сваю чаргу ў раздзеле „Незалежная культура — рэгіёны" аб гісторыі непадцэнзурнага друку на Полаччыне (1971-1996) піша Алесь Аркуш, незалежны публіцыст, паэт і выдавец. Ягоны тэкст аб пачынальніку друкарства і асветніку Францішку Скарыне пераклаў Аляксандр Максімюк. Алесь Аркуш засяродзіўся галоўным чынам на літаратурным альманаху „Блакітны ліхтар", першым праекце непадцэнзурнага друку на Полаччыне. «Гэтае выданне ажыццявіла моладзевая арганізацыя „Літаратурна-мастацкае згуртаванне творцаў імя Максіма Багдановіча", у якую ў сакрэце запісалася некалькі студэнтаў ды навапалацкіх вучняў старэйшых класаў. Ініцыятарам перыядычнага выдання быў Вінцэсь Мудроў, будучы беларускі літаратар, які ўласнаручна падрыхтаваў першы нумар „Блакітнага ліхтара". Альманах налічваў 12 старонак і змяшчаў некалькі ўласных матэрыялаў: вершы самога Мудрова ды яго сябры Валерыя Шлыкава, а таксама развагі аб беларускай мове», — успамінае Алесь Аркуш. Росквіт „Блакітнага ліхтара" гэта 1973 і 1974 гады. Тады паказалася 12 нумароў. Вядома, гісторыя часопіса была нядоўгая; усе нумары канфіскаваў тагачасны КДБ.

У „Дарогах да свабоды..." у сваю чаргу Міраслаў Хаецкі, дзеяч антыкамуністычнай апазіцыі апісвае, „як з дапамогай гумкі ад трусоў развальвалі мы камунізм". Апісвае ён як у незалежным выдавецтве „NOWA" ўдавалася выпускаць у сярэднім за кожныя два тыдні новую кнігу ды да таго ў дзяржаве — як гэта называе — дзе ўлада старалася кантраляваць усё і ўсіх. Паэт і літаратурны крытык, рэдактар парыжскай „Культуры" і супрацоўнік Радыё Вольная Еўропа Лешак Шаруга спрабуе расказаць аб поглядах і рэакцыях Ежы Гедройца і супрацоўнікаў кіраванай ім „Культуры" на падзеі польскага Кастрычніка 1956 г.

У кніжцы апынуліся таксама роздумы аб феномене руху пакалення шасцідзесятых гадоў на Украіне, слоўнік дысідэнтаў у камуністычных краінах у 1956-1989 гадах ды шэраг іншых апісанняў дарог да свабоды. У вельмі цікавым тэксце гісторыка Аркадыюша Малышкі аб пасквілях на І сакратара ПАРП Эдварда Герка апынуўся вершык, які мог бы адносіцца несумненна да некаторых уладароў (не маю тут на думцы Польшчу ці краіны ўспомненыя ў „Дарогах..."). Яго апошня страфа гучыць: *Ludu mój, ludu, czy to moja wina/ Żem się bunty uczył tłumić od Stalina./ Gdyby żył Stalin, byłby ze mnie dumny/ A wy mnie chcecie wpakować do trumny.*

Можна шкадаваць, што так мала месца і ў час канферэнцыі, і ў яе кніжным запісе адведзена праблематыцы незалежнай Беларусі. Гэта ж якраз цяпер спроба фіксацыі яе праяваў была б найбольш жывая, а не толькі абмяжоўвалася б да ўспамінаў. А мо каб так сталася, трэба было б правесці асобную канферэнцыю і выдаць чарговую кніжыцу, як гэтая аб „Дарогах да свабоды".

Раіна СТЭФАНЧУК

Глыбокае і Глыбоччына

Без гісторыі няма будучыні

http://hlybokaje.narod.ru

Пэўна ў кожнай краіне ёсць невялікія, нават малыя, мястэчкі, якія, тым не менш, многа значаць у яе гісторыі. У Беларусі такім мястэчкам без перабольшання можна назваць Глыбокае, што знаходзіцца на поўначы, у Віцебскай вобласці. На сайт гэтага старажытнага горада мы сёння і завітаем.

Каб гэта зрабіць, дастаткова набраць на сваім камп'ютэры інтэрнэтны адрас **http://hlybokaje.narod.ru**, і перад намі адкрыецца ні на што непадобнае выяўленне першай старонкі сайта, які мае назву „Глыбокае і Глыбоччына". Незвычайнасць выяўлення перадае яго дызайн — металічна-шэры колер з рознымі паўтонамі.

Тое, што сайт закліканы перадаць збольшага гістарычную інфармацыю аб гэтых паўночна-беларускіх мясцінах, становіцца зразумела, калі прачытаем яго дэвіз: „Без гісторыі няма будучыні" і пабачым старажытны герб Глыбокага з правага боку выяўлення.

Выйсці да рубрык сайта, як і мае быць, знаходзяцца злева. А пасярэдзіне яго ўладальнік і аўтар Аляксей Тарыкаў распавядае аб сваім глыбоцкім партале. „У жніўні месяцы 2007 года споўнілася 2 гады сайту «Глыбокае і Глыбоччына», — дае ён невялікую гістарычную даведку. — За гэты час нас наведала каля 10 000 чалавек з усёй Беларусі, Польшчы, Літвы, ЗША, Аўстраліі, Германіі... Гэты сайт не мае аналагаў у Інтэрнэце па колькасці інфармацыі сабранай пра гэты рэгіён". Так ці не так — праверыць не ўдалося, але з упэўненасцю можна адзначыць, што „Глыбокае і Глыбоччына" дасць віртуальнаму госцю добрае ўяўленне аб даных мясцінах, для чаго дастаткова зазірнуць у рубрыкі, напрыклад, „Глыбокае". Тут мы можам не толькі даведацца пра розныя перыяды ў жыцці мястэчка, але і пазнаёміцца з версіяй паходжання яго не зусім звычайнай назвы. Так, існуе паданне, што назва пайшла ад падзей, звязаных са згубай адным з мясцовых магнатаў каня ў возеры.

Рубрыка „Глыбоччына" распавядае пра некаторыя навакольныя населеныя пункты Глыбоцкага раёна. Такая акалічнасць сайта робіць яго яшчэ больш арыгінальным, бо далёка не ў кожным краязнаўчым партале патрыёты таго ці іншага цэнтра тэрыторыі распавядаюць пра невялікія вёскі, што месцяцца па-суседску.

Даволі пазнавальнай з'яўляецца старонка „Славутыя землякі". Шчыра кажучы, з нечаканасцю для сябе даведаўся я, што глыбоцкае наваколле дало свету такіх слаўных людзей як Ігнат Буйніцкі — заснавальнік першага прафесійнага тэатра ў Беларусі, Павел Сухі — авіяканструктар, стваральнік самалётаў „Су", Эліэзэр Бэн-Егуда — чалавек, які адрадзіў іўрыт, а таксама тых, якія вядомыя амаль кожнаму беларусу — Вацлаў Ластоўскі і Ігнат Дамейка, ну і, вядома, многіх іншых.

Цікавай падаецца і старонка „Тапанімічны слоўнік". Тут аўтар распавядае пра найменні і некаторыя асаблівасці глыбоцкіх вёсак. Паходжанне назваў дае добрае ўяўленне таго, як зваліся і чым займаліся людзі, якія вякамі жылі на гэтай тэрыторыі.

Старонка „Рознае" змяшчае разнастайную несістэматызаваную гістарычную і геаграфічную інфармацыю аб падзеях на Глыбоччыне.

Мяркую, што пазнаёміўшыся з даным сайтам, цікаўны да беларускай гісторыі чалавек знойдзе для сябе нямала карысных ведаў.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь, беларусы...

Адразу за грандамі

За футбольнымі кубкавымі жарсцямі чэмпіянат свету па веславанні на байдарках і каноэ застаўся на заднім плане. Але ровень сусветнага форуму мацнейшых весляроў Зямлі варты таго, каб звярнуцца да яго вынікаў. Тым больш, што беларускія прадстаўнікі ў цэлым пацвердзілі свае высокія пазіцыі.

Чэмпіянат праходзіў у Нямеччыне, краіне, дзе веславанне з'яўляецца адным з прыярытэтных відаў спорту. Па папулярнасці на радзіме Гётэ і Баха яно саступае толькі футболу, біятлону і скачкам на лыжах з трампліна. Адсюль і такія вынікі тэўтонцаў. Спаборнічаць з імі за агульнакамандавае першынство на топ-турнірах здольныя толькі мадзьяры. У Дуйсбургу, на каналах якога адбываліся заезды, дзвюм дружынам-фаварытам зноў не было роўных. У Беларусі веславанне па папулярнасці не ўваходзіць нават у дзесятку, але нацыянальная школа ў стане рыхтаваць майстроў вышэйшага класа. На гэтым чэмпіянаце, выйграўшы 4 медалі, нашы мужчыны-весляры занялі „свой пачэсны пасад" адразу за лідэрамі. Вось лічбавыя паказчыкі пяцёркі мацнейшых зборных: Венгрыя — 10 узнагарод (5 залатых медалёў плюс 5 бронзавых), Германія — 10 (4 + 5 + 1), Беларусь — 4 (1 + 2 + 1), Расія — 4 (1 + 2 + 1), Польшча — 4 (0 + 2 + 2). Па тры разы на п'едэстал уздымаліся славакі, румыны і літоўцы, а ўсяго ў мужчын вызначыліся рэпрэзентанты 17 краін.

Галоўнымі лаўрэатамі з нашых сталі Раман Петрушэнка і Вадзім Махнеў, якія выступаюць на парнай байдарцы. Гэты дуэт ёсць адным з найбольш тытулаваных у свеце, толькі нашы хлопцы могуць на роўных змагацца з прызнанай нямецкай парай Рональд Раўхе — Цім Віскотэр. Петрушэнка і Махнеў упершыню выйшлі на авансцэну ў 2003 годзе, калі сенсацыйна ўзялі срэбра чэмпіянату свету. Потым была бронза афінскай алімпіяды. І вось новы поспех. На дыстанцыі 200 метраў нашы сталі чэмпіёнамі, апярэдзіўшы грозных немцаў, а на алімпійскай пяцісотцы саступілі тым жа канкурэнтам, задаволіўшыся важкім срэбрам.

Вызначылася і беларуская байдарка-чацвёрка, за якую выступалі Станіслаў Стрэльчанка, Дзяніс Жыгадла, Сяргей Фіндзюкевіч, Руслан Бічан. На фініш адлегласці 500 метраў яны прыплылі другімі, саступіўшы толькі славацкаму квартэту. Яшчэ адзін медаль у беларускую скарбонку прынёс экіпаж канаістаў на спрынтэрскай дыстанцыі 200 метраў — Дзмітрый Рабчанка, Дзмітрый Вайцішкін, Канстанцін Шчарбак і Аляксандр Ваўчэцкі сталі бронзавымі прызёрамі. Не так даўно гэты калектыў быў прызёрам еўрапейскага чэмпіянату. А вось браты Багдановічы на гэты раз засталіся без узнагарод — у іх 5-е і 7-е месцы ў розных намінацыях. Але галоўны нарматыў — заваяванне алімпійскіх ліцэнзій быў выкананы. Усяго беларусы атрымалі 6 ліцэнзій у трох тыпах суднаў — мужчынскіх байдарцы-двойцы, байдарцы-чацвёрцы і каноэ-двойцы. Не заваяваў пуцёўкі ў Пекін пакуль ветэран каноэ Аляксандр Жукоўскі. Зрабіць гэта можна цяпер толькі стаўшы ў наступным сезоне чэмпіёнам Еўропы. Адразу пасля Нямеччыны ўся сусветная эліта веславання паехала ў Кітай выпрабоўваць алімпійскія каналы.

Што датычыць вяслярак, то там таксама дамінавалі Германія і Венгрыя (па 8 медалёў). Беларускія дзяўчаты ў прызёры аб'ектыўна трапіць не змаглі.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Варта самаўраду падумаць

У Пашкоўшчыне даўней была пачатковая школа. Знаходзілася яна за вёскай, непадалёк шашы Кляшчэлі — Бельск-Падляшскі. У верхняй частцы будынка, „на горцы", змяшчалася кватэра кіраўніка школы Станіслава Заянчкоўскага. У шасцідзесятыя гады заязджаў я ў Пашкоўшчыну з кінаперасоўкай. Паколькі ў Пашкоўшчыне не было святліцы, тады кінасеансы арганізаваліся ў школьнай зале. Шмат людзей збіралася. Прыходзілі не толькі жыхары Пашкоўшчыны, але і суседніх Градалёў ды Тапчыкалаў. Найбольшым поспехам карысталіся савецкія фільмы пра вайну ды каханне. Памятаю, напрыклад, як дэманстравалі кінакарціну „Уваскрэсенне" паводле рамана Льва Талстога. Кінагледачоў столькі нахлынула, што мы вымушаны былі арганізаваць дадатковыя сеансы (па правілах пажарнай бяспечнасці ў зале магло памясціцца адно 55 чалавек). Прыйшлі нават старэнькія бабулькі, якія ніколі ў кіно не заходзілі. Са слязінкай у вачах развіталіся яны з абслугай, дзякавалі за цудоўнае відовішча.

Закінуты будынак школы ў Пашкоўшчыне

З таго часу мінула шмат гадоў. У час трансфармацыі ліквідавалі школу. Некалькі гадоў пазней у школьным будынку арганізаваліся дыскатэкі, але з цягам часу прадпрымальнік вымушаны быў закрыць гэты бізнес. Зараз дзетак з Пашкоўшчыны давозяць у школу ў Орлю, а будынак з кожным годам пападае ў руіну. Праязджаў я праз Пашкоўшчыну ў час веласіпедных вандровак па Бельшчыне і сэрца сціскалася ад болю, калі глядзеў на знаёмае месца. Жаласны выгляд звонку, разбітыя шыбы заклікаюць неба да помсты. Няўжо арлянскі самаўрад можа дазволіць на такое марнатраўства? Будынак з'яўляецца маёмасцю Арлянскай гміны і можна было б яго выкарыстаць для грамадскіх мэт, напрыклад, на вясковую святліцу. Пэўна скажаце, даражэнькія, што няма грошай на рамонт. А ці не варта супольнымі сіламі, разам з жыхарамі вёскі, добраўпарадкаваць маёмасць? Хоць грамадскія пачыны разам з мінулай эпохай адышлі ў нябыт, але, на маю думку, скурка варта вычынкі. Варта затым самаўрадаўцам падумаць і зрабіць жыхарам Пашкоўшчыны адпаведную прапанову. Спатрэбіцца адно добрая воля абодвух бакоў — мясцовага самаўрада і насельніцтва.

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Жыццё бабулі Тоні

Антаніне Амельянюк з Трасцянкі прыйшлося жыць і пры паляках, і саветах, і немцах, і пры „камуне" (як цяпер завуць), і жыве яшчэ ў XXI стагоддзі. Праўда, здароўе ў бабулі ўжо слабенькае, але памяць — го, го!

Нарадзілася бабка Тоня 12 лютага 1924 года ў мнагадзетнай сям'і Вольгі і Аляксандра Федарукоў, у якіх да выезду ў Расію ў 1915 годзе было ўжо двое дзяцей. Усе з Расіі вярнуліся шчасліва. З васьмі дзяцей пасля першай вайны двое памерлі маленькімі, а адна сястра ў 10 год. А цяпер асталася толькі Тоня і брат, які пражывае ў Беластоку.

Тады, перад вайной, жылі яны з гаспадаркі. Дзеці памагалі чым маглі. Абавязкам Тоні было нарваць два мяшкі зелля, бо, апрача кароў і авечак, трымалі курэй, гусей, індыкоў і качак. Нават коней было двое. Найгорш аднак успамінае бабка Тоня школу, таму што была яна неадважнай і баялася гаварыць. Затое з малявання мела самыя пяцёркі! Хоць з цяжкасцю, але чатыры класы „паўшэхнай" скончыла.

Як прыйшлі саветы, то адразу бралі па чарзе на работу трасцяніцкіх хлопчыкаў і дзяўчат. Хадзілі яны ў адлеглы за 12 км Заблудаў капаць зямлю пад аэрадром. Выпадала раз або два разы ў тыдзень. Бабка расказвала, што там разам з трасцяніцкімі працавалі падсудзімыя жанчыны з калгасаў, якія трапілі да штрафной работы за пакражы. І яшчэ ўспамінае бабуля Тоня, як адзін чалавек з Трасцянкі Дзміцер чакаў саветаў, а яны, старога ўжо чалавека, выслалі ставіць метры пад Жэдню.

У 1941 годзе, калі прыйшлі немцы, то Тоніны два браты хутка трапілі на прымусовыя работы ў Прусію.

— У 1943 годзе і мяне немцы забралі на тыя работы. Спачатку завезлі нас фурманкамі ў Беласток і пасадзілі за калючым дротам. Так мы сядзелі з тыдзень, добра, што мелі свой хлеб і сала, а то амаль нас там не кармілі. Потым пагрузілі ў таварныя вагоны. Зараз за Беластокам мы з сяброўкай выскачылі з таго цягніка як замарудзіў ход, і нам удалося шчасліва дабрацца да знаёмых. Тыя далі знаць маме, і мяне завезлі да замужняй маёй сястры ў Фальваркі. А на зіму я вярнулася дахаты, бо бацькі ўлагодзілі мясцовую паліцыю, што мае два браты ўжо працуюць на немцаў. І так удалося далей памагаць бацькам. Неўзабаве скончылася вайна.

Пасля вайны многія дзяўчаты з нашай вёскі выходзілі замуж. Так было і са мною. Ужо ў 1946 годзе выйшла я замуж за прыгожага, стройнага аднавяскоўца Колю Амельянюка. Хутка купілі мы старую хатку, каб жыць асобна. Трохі за сплачаныя братамі грошы. А там нажывалі і клуню, і хлявы, а таксама каня. У нас нарадзілася дачка Маня. Больш дзяцей не было. Гадавалі дачку, вучылі яе. Зямлі ў нас было мала — 7,5 гектара, а трэба было і ўсе налогі аплаціць. Жылося нам нялёгка, але спакойна. Пакуль жыла мая мама, дык добра было. Потым мама захварэла, доўга ляжала ў бальніцы. Усё лета я працавала ў полі, а ў нядзельку ехала праведаць маму. Было цяжка. Восенню мама памерла і я так перажывала, што мне адняло ногі і рукі. Падлячыўшыся, я пайшла на сялянскую пенсію аддаўшы зямлю дзяржаве. Мой муж стаў ездзіць на працу ў Беласток. Дачка Маня ўжо была замужняя і жыла ў Беластоку. На пенсіі гадавала я качак, авечак, а муж цёлку глядзеў. Так мы дажылі разам да снежня 1993 года. Коля памёр раптоўна, меў інфаркт. І так я асталася ўдавою. Стала займацца толькі сваім агародам на панадворку. Цяпер зусім недамагаю. Апякуецца мною дачка. Зімою забірае мяне да сябе ў Беласток, а вясною прывозіць у родную хату. І тут жывём з дачкой і зяцем Васем усё лета. Мой зяць — добры гаспадар. Аднавіў нашу старую хату, абгарадзіў нанава і трымае парадак на панадворку. У дачкі Мані двое дзетак — дачка і сын. Дачка выйшла замуж за бацюшку, што ў Дубічах, а сын жанаты ў Беластоку. Так, што маю двое ўнукаў, — гаворыць бабуля Тоня, — а ад іх трох праўнукаў. І ўсе бываюць часта ў нас, у Трасцянцы.

І аўтарцы гэтага допісу нядаўна прыйшлося спаткацца з усёй сям'ёй Тоні Амельянюк, так як яе дачка Маня з мужам святкавалі 40-годдзе з дня шлюбу якраз тут, у Трасцянцы, разам з бабкай і прабабкай.

Трэба яшчэ дадаць, што бабуля вельмі набожная. У нядзельку і кожнае свята возяць яе Маня з Васем на калясцы ў мясцовую царкву памаліцца Богу.

Рута

Фота Міры ЛУКШЫ

Бабуля Антаніна з сяброўкай Насцяй Сцепанюк (не жыве) у акне сваёй адноўленай хаты.

Еўрарэгіён Нёман-2007

IX Многагаліновая выстаўка-кірмаш

Шаноўныя Спадары і Спадарыні!

Нацыянальны выставачны цэнтр „Белэкспа" Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь запрашае Вас прыняць удзел у працах IX Многагаліновай выстаўкі-кірмашу „ЕЎРАРЭГІЁН НЁМАН-2007", якая адбудзецца з 19 па 21 верасня 2007 г.

Выстаўка праводзіцца пры садзеянні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта і Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта.

У дадзеным мерапрыемстве прымуць удзел прамысловыя прадпрыемствы і прадпрымальнікі краін, якія ўваходзяць у састаў Еўрарэгіёна „Нёман" — Гродзенскай вобласці Рэспублікі Беларусь, Польшчы, Літвы і Расіі.

Мэта выстаўкі „Еўрарэгіён Нёман-2007" — актывізацыя працэсаў супрацоўніцтва паміж суб'ектамі гаспадарання краін, якія маюць супольную граніцу — Беларуссю, Польшчай, Літвой і Расіяй; заключэнне дагавораў; дэманстрацыя і продаж тавараў народнага ўжытку.

Удзельнічаючы ў многагаліновай выстаўцы-кірмашы „Еўрарэгіён Нёман-2007", Вы атрымаеце магчымасць знайсці новых дзелавых партнёраў і наладзіць стабільныя сувязі.

Тэматыка выстаўкі:

Харчовая прамысловасць:

— тэхніка і абсталяванне для сельскагаспадарчай вытворчасці, фермерскіх гаспадарак;

— абсталяванне для перапрацоўкі малочнай, мясной і рыбнай прамысловасці;

— мясныя і малочныя прадукты;

— прадукцыя сельскай гаспадаркі;

— абсталяванне для хлебапякарнай, макароннай, кандытарскай прамысловасці;

— кандытарскія і хлебабулачныя вырабы;

— спіртныя напоі, віно, піва, безалкагольныя напоі, адпаведнае тэхналагічнае абсталяванне;

— халадзільнае абсталяванне, тэхналогіі захоўвання харчовых прадуктаў;

— гандлёвае абсталяванне для сістэмы грамадскага харчавання, магазінаў, кіёскаў, мабільнае гандлёвае абсталяванне.

Тара і ўпакоўка, этыкетка, упаковачна-фасовачнае абсталяванне і матэрыялы. Спажывецкія тавары і бытавая тэхніка:

— тэкстыль, адзенне, абутак, трыкатаж, скураная галантарэя, футравыя вырабы;

— тавары для дзяцей, спартыўныя тавары;

— касметыка і парфумерыя;

— біжутэрыя, ювелірныя вырабы, сувеніры, гадзіннікі;

— аўдыё-, відэа-, фотатэхніка;

— мэбля і дывановыя вырабы;

— гаспадарчыя тавары, бытавая хімія.

Будаўніцтва:

— будаўнічыя матэрыялы;

— вырабы і канструкцыі, тэхналогіі і абсталяванне для будаўніцтва;

— дызайн і інтэр'ер (дэкаратыўныя і аддзелачныя матэрыялы, асвятляльнае абсталяванне, кандыцыянеры).

Тэхніка і абсталяванне для аховы навакольнага асяроддзя, догляд за ландшафтам.

Турызм і адпачынак.

Па пытаннях удзельніцтва або наведання выстаўкі звяртайцеся па тэлефоне/факсе ў Мінску: (375-17) 334-45-37; э-мейл: bublic@belexpo.by

Кіраўнік праекта — Людміла Бублевіч

Беларускі каляндар

З вялікім спазненнем паявіўся „Беларускі каляндар" на 2007 год, выдадзены Таварыствам беларускай культуры. Прычына спазнення — нетэрміновая датацыя Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі на яго выданне. Як гэта кажуць — лепш позна, чымсьці зусім. Найбольш цешацца чытачы-калекцыянеры, якія маюць на сваіх паліцах камплект „Беларускіх календароў" ад першага штогодніка з 1957 года.

Каляндар падрыхтавала да друку рэдакцыйная калегія ў складзе: Ян Сычэўскі (старшыня), Валянціна Ласкевіч і Уладзімір Юзвюк. У. Юзвюк апрацаваў каляндарную частку. Багатую хроніку мерапрыемстваў беларускай культуры за 2006 год (63 старонкі) апрацавала Валянціна Ласкевіч. Многа месца (39 старонак) адведзена 50-гадоваму юбілею Беларускага грамадска-культурнага таварыства, які адзначаўся 25 лютага 2006 года ў зале Ваяводскай управы ў Беластоку. Тэксты календара ўпрыгожылі 73 здымкі з беларускіх культурных мерапрыемстваў, праведзеных у 2006 годзе на Беласточчыне. Аўтары здымкаў: Е. Ласкевіч, А. Германюк і М. Леўчук.

Вельмі добра і карысна, асабліва беларускім дзеячам, што ў календары змешчана Рамавая Канвенцыя аб ахове нацыянальных меншасцей, прынятая ў Страсбургу 15 сакавіка 2002 года, а таксама закон аб аб'яднаннях ад 7 красавіка 1989 года.

На літаратурных старонках календара змешчаны вершы членаў Літаб'яднання „Белавежа": Алены Анішэўскай, Юрыя Баены, Дзмітры Шатыловіча і Віктара Шведа, а таксама вершы і абрадавая сцэнка „Хрысціны" Ніны Цыванюк.

Кніжны „Беларускі каляндар" на 2007 год надрукаваны на добрай паперы, з прыгожай вокладкай у выдавецтве А. Сохара ў Беластоку.

Віктар ШВЕД

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2007 r. upływa 5 września 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 000 egz.

Суседскія былі

ЗАЧАРАВАНЫЯ ІНДЫКІ

— Ах вы злыдні, ай вы брыдоты, чарнакніжнікі паскудныя, чарнэлі недарэзаныя, погань прыезджая, прыблуды бяздомныя, дрэнь басяцкая, галота жабрацкая, скаціна бязрогая і рагатая, — раўла нямым голасам цётка Каця, барабанячы кулакамі ў дзверы вясковай школы, дзе мірна і спакойна, нікога не чапаючы, спала, салодка сапучы ў дзіркі пад насамі брыгада маладых студэнтаў. Спала салодкім глыбокім сном, як выканаўшы на выдатна невыканальную місію па ўратаванню цывілізацыі марсіян. Гэтая група маладых людзей прыехала на летнія канікулы ў калгас „Шляхам Ільіча", каб падзарабіць крыху грошай на рамонце будынка мясцовага клуба, які быў будаваны як фальварак яшчэ да нараджэння таго ж Ільіча, а пры ім, пры Ільічу, адабраны ў тутэйшага ні то графа, ні то пана. І з таго часу да яго не датыкалася рука рамонтніка...

— Каб вы ўсе падохлі, каб вас пярун пабіў, каб вас зямелька завярнула, каб вы хаты сваёй не пазналі, каб вас чорт забраў, каб вы свету божага не бачылі, — не супакойвалася жанчына. — А бадай вам усё жыццё на таблеткі працаваць, а каб вам сваёй долі не мець, хай вам усё гадочкі без пакою і сну спакойнага пройдуць...

— А што здарылася, цётка? — адчыніў дзверы заспаны Толік. Яго апухлы твар яскрава і недвухсэнсоўна паказваў, што пасля ўчарашняга бурнага адзначэння першага авансу, кожная дробная думка, а не тое што дзікі крык ашалелай бабы, выклікае жудасны галаўны боль у сярэдзіне яго чэрапа, дзе, калі верыць яго дыпломнаму кіраўніку прафесару Кастусёву, мазгі ўжо даўно высахлі ад надзвычай ранняга ў гісторыі чалавецтва выпадку бязмернага ўжывання алкаголю.

— Што вы з маімі індыкамі зрабілі? — яшчэ мацней залямантавала кабета. — Забаву сабе знайшлі, хатнюю птушку труціць? Дзе начальства? Дзе старшыня? Дзе яны! Дзе хоць хто-небудзь?

Яе енк быў такі моцны, што неўзабаве прынёсся і старшыня, Станіслаў Пятровіч, і ўсё калгаснае начальства зляцелася як на пажар. Акурат працоўны дзень пачынаўся і ўсе былі на месцы.

— Што здарылася, Сямёнаўна? Чаго нашых работнікаў непакоіш? — стаў залагоджваць апантаную жанчыну Станіслаў Пятровіч. — Без іх працы цябе некалі ў клубе насмерць заваліць прагніўшым дахам. Ты ж там прыбіральшчыцай лічышся.

— А з імі я з голаду памру, пайду па свеце з торбай, — так пачала махаць рукамі Сямёнаўна, што старшыня пашкадаваў, што не ўзяў з сабой некалькі мяхоў збожжа (памалола б не горш добрага млына). — Навошта яны маіх індыкоў патруцілі? Вунь, ляжаць без руху, нібыта і не жылі ніколі.

Старшыня паглядзеў спачатку на нерухомых птушак, а пасля зірнуў у вочы Толіку такім позіркам, нібыта той здрадзіў немцам месцазнаходжанне яго партызанскага атрада, хоць вайна скончылася так даўно, што малады хлопец і немцаў тых, і партызанаў бачыў толькі ў савецкім кіно.

— Нічога ні пра якіх індыкоў я не ведаю, — паціснуў плячамі хлопец. — Была, праўда, учора пра іх размова. З намі муж гэтай цёткі выпіваў. Самагонку нам ноччу недзе купляў. Паскудная такая самагонка была, лепш мы пілі б салярку. Відаць, з апілак нехта гнаў. Ды і апілкі хіба што гнілыя былі, як зубы ў гэтай кабеты. А мы яе мужу за тое, што прыносіў нам тую атруту, налівалі задарма. Ну то як закончылася закуска, ён і кажа, што можа індыка прынесці. Але як пайшоў па індыка, так і сам прапаў. Як карова языком злізала. Больш мы яго не бачылі. Знік так хутка, як наш аванс.

— А хто тут у нас продажам самагонкі займаецца? — пацікавіўся ўчастковы, які таксама прысунуўся паўзірацца на тую ранішнюю забаву.

— А то ты не ведаеш? Ай-яй-яй! — замахала галавой цётка Каця. — Якая авечка! Нічога не ведае. А яшчэ ўчастковы! Ну то скажу табе, па вялікаму сакрэту. Гэта я прадаю гарэлку людзям. Ды не тое слова, прадаю. Можна сказаць, аддаю за так. За капейкі. І дзякуй ніхто не скажа. А ты сам мала яе ў мяне выцягнуў? А з цябе, як з улады, я нічога не брала! Што няпраўду кажу?!

— Што ты цётка вярзеш пры людзях, — пачаў хавацца ў натоўпе ўчастковы. — Не пра гэта зараз размова. Трэба напачатку высветліць, хто тваіх індыкоў пабіў.

— Вось і высвятляй. На тое ты і міліцыя, — зноў улез у размову старшыня, напалохаўшыся, што знерваваная жанчына прылюдна абвесціць і пра тое, у каго і колькі ён сам набывае алкаголю. — Мае работнікі сцвярджаюць, што не душылі тых індыкоў, каб яны падохлі, і не наводзілі на іх сурокаў ды чараў, каб яны, падлы, паздыхалі. Вочы б мае іх не бачылі. Можа спытаць у Кацькінага мужа што з імі здарылася. Па ўсім відаць, што менавіта ён апошні бачыў тых індыкоў жывымі.

— Я і сам хацеў гэта прапанаваць, — высунуўся на паўкорпуса з натоўпу ўчастковы і закрычаў у бок Кацькінай хаты, што стаяла акурат побач са школай: — Раман, хопіць спаць! Сонца ўжо на небе. Выйдзі да людзей.

На ганку з'явілася заспаная постаць, у трусах, майцы і гумовых ботах, з добра памятым тварам. Падышла яна да нерухома ляжачых на падворку індыкоў, узяла аднаго з іх на рукі і пачала гладзіць.

— Раман, — звярнуўся старшыня, — тут твая жонка маіх работнікаў абгаворвае. У вёсцы ўжо не засталося людзей, на каго яна не наракала б. Вось, узялася зараз і за прыезджых. Можа ты ведаеш, ад чаго індыкі ногі адкінулі?

— Ведаю, — ляніва адказаў Раман. — Ад таго, што мая Кацька самагонку паскудную цісне з абы-чаго. Трохі мы ўчора з хлопцамі прычасціліся. А закуска скончылася. Пайшоў я ўзяць чаго з'есці. Зайшоў у хлеў, і там мяне званітавала ад такой гадкай гарэлкі. А індыкі, гляджу, не такія дурныя, як мы думаем. Пачулі алкаголь і давай дзюбаць што я нарыгаў. Гарэлку мая баба хоць і няякасную робіць, але моцную, халера яе бяры. Тут на яе наракаць няма чаго. Вось індыкі і панапіваліся. Зараз адаспіцца закуска мая дарагая.

І тут той індык, што быў на руках у Рамана, падняў галаву і заклякатаў. Астатнія, пачуўшы крык галоўнага, паўскоквалі на ногі і сталі, хістаючыся, лазіць без толку сюды-туды. Студэнты, узяўшыся за галовы, пацягнуліся спаць далей. Іншыя прысутныя на бясплатным ранішнім канцэрце пасунуліся на работу, а цётка Каця замаўчала і пацягнулася да сябе ў паветку ціснуць чарговую партыю моцнай, але няякаснай самагонкі.

Віктар САЗОНАЎ

Адгаданка

1. кавалак распілаванага і рассечанага бервяна на паліва, 2. сухія праснакі з пшанічнай мукі, якія яўрэі выпякалі да Вялікадня, 3. буйны афрыканскі драпежнік сямейства кашэчых, 4. на чужы рот яго не павесіш, 5. гразь змешаная са снегам; бязладдзе, неразбярыха, 6. бацька Ахілеса, 7. ударны царкоўны інструмент з языком, 8. яе цягнулі дзедка, бабка, унучка, сучка, 9. тулава з душою, 10. напр. чарніца, брусніца або суніца, 11. нахіл набок судна, самалёта, 12. плецены абутак з лыка, 13. перыядычнае пасяджэнне ўстановы, напр. гміннай рады, 14. жонка цара, 15. завостраны кавалак дрэва, які выбіваюць клінам, 16. гульня ў тэніс, у якой партнёрамі з'яўляюцца змешаныя пары, 17. Эдэм, 18. пярэдняя частка галавы ў дзіка.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 30 нумара

Бал, воўна, дуб, лыжы, пяць, рэч, сто, сюіта, чай, шыба.

Рашэнне: **Шыбаючы на чужы лоб трэба і свой падстаўляць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Яну Міхалюку** з Чыжоў і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

02.09 – 08.09



Баран (22.03. — 20.04.) Зачаруеш усіх сваёй красой — ад аматараў не дасі рады адбіцца! Падзеі як на каруселі; не вырашай аб нічым важным у гэты момант. Пазбягай прагнасці.

Бык (21.04. — 21.05.) Час спрыяе любові. Наладзіш таксама карысныя фінансавыя кантакты. Асабліва лёгка даюцца табе зарабіцца немалыя грошы.

Блізняты (22.05. — 22.06.) Не стаў спраў на лязе нажа, бо могуць асабліва папсавацца сямейныя адносіны. Сустрэнеш кагосьці, хто цябе рассмешыць і давядзе да таго, што забудзешся аб штодзённых клопатах. Грошы хутчэй збіраеш, чым выдаеш.

Рак (23.06. — 23.07.) Усе твае сакрэты могуць выявіцца. Не давайся намовіцца на прызнанні, асабліва тым, з кім працуеш. Хочацца выдаваць грошы на шыкоўныя і дарагія рэчы.

Леў (24.07. — 23.08.) Ніхто не ў змозе пагнявацца на цябе. Калі хочаш дарабіцца, не раскідвайся грашыма направа і налева. З 7.09. будзь асцярожны ў фінансавых справах, каб не страціць зашмат!

Дзева (24.08. — 23.09.) Сатурн дасць табе ў косць! Асабліва калі ты непастаянны, да таго няслоўны. Стой моцна на зямлі, бо можаш мець такія клопаты, што цябе надломяць. З усяго мусіш сумленна разлічыцца.

Шалі (24.09. — 23.10.) Ты ў проста фантастычнай форме! Вельмі добра каціруешся ў кампаніі, у інтарэсах і падарожжах. Ідэальны час, каб пазнаёміцца з пастаяннай асобай.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Лепшы абарот спраў чым тады, калі было табе пад горку. З 7.09. перастануць цябе мучыць фінансавыя клопаты — некаторыя самі развяжуцца, аб іншых кінеш думаць. Магчымы неспадзяваны прыбытак у кашальку!

Стралец (23.11. — 22.12.) Адкрываюцца перад табой новыя магчымасці. Знакаміты настрой, арыгінальныя ідэі, лёгкае выкарыстанне нагод. 2-6.09. не будзе паразы, калі будзеш памяркоўны; не дзяры носа, бо можаш асмяшыцца.

Казярог (23.12. — 20.01.) Маеш нагоды змяніць сваё жыццё і ў прафесіі, і ў прыватнасці. Тое, што цябе цяпер спаткае, прынясе немалыя плады ў будучыні.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Дзякуючы засяроджанасці і адпаведнай стратэгіі свае справы можаш вывесці на простую дарогу. Да 5.09. ад некаторых напрамкаў мусіш адрачыся, а за іншыя ўзяцца ў першую чаргу. Не бярыся за справы патрабуючыя спакою і дыпламатыі. З 7.09. магчымыя складанасці на працы і ў фінансах — будзеш нервовы ды разлезлы і неабачлівы.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Справы складваюцца няблага. Будзеш баявіты, прадпрымальны, спраўны пры ўласных інтарэсах (з 7.09. дасі рады з кожнай справай!). Затое паблытаецца ў цябе крыху ў пачуццях. Патрабуеш рацыянальнай дыеты (еж як найбольш арэхаў і зерня). Цяжкасці мабілізуюць!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960